Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 26 (440) | Аўторак, 11 ліпеня 1939 года | Цана 20 кап.

XIX ГОД БАРАЦЬБЫ І ПЕРАМОГ

У ноч на 11 ліпеня 1920 года, пад націскам гераічнай Чырвонай Арміі, белапалякі пакінулі Менск. Горад быў у агні. Пылаў вакзал, дамы, заводскія карпусы. Белапалякі адступалі, пакідаючы пасля сябе абгарэлыя фабрычныя трубы, узарваныя масты, разбураныя вёскі.

Час нямецкай і польскай акупацый— адна з найбольш цяжкіх і жахлівых старонак у гісторыі Беларусі. Разгулу нямецкай і польскай ваеншчыны не было меры. Яўрэйскія пагромы, катаванні, расстрэлы, знішчэнне агнём і мячом цэлых паселішчаў, гвалтаванне — вось што прынеслі на сваіх штыхах «цывілізаваныя варвары» з Берліна і Варшавы.

У тыя змрочныя дні падняліся супроць ненавіснага польскага пана і старыя і малыя. Беларускаму народу дапамог вызваліцца ад драпежнікаў—нямецкіх баронаў, патомкаў псоў-рыцараў, і польскіх крывасмокаў-паноў—вялікі рускі народ, мудрая партыя Леніна—Сталіна. Працоўныя Беларусі скінулі ярмо эксплаатацыі. Свабодалюбівы беларускі народ адчуў сябе гаспадаром.

Больш не чуваць сумных песень сялянак Беларусі, якія ў дарэвалюцыйныя часы апявалі сваё гора-нядолю:

Калі я маленькай у калысцы ляжала,
Гора са мной ля калыскі стаяла,
Калі я маленькай каля лаўкі хадзіла,
Гора мяне за ручанькі вадзіла.
Я ад гора за сіняе мора —
Гора са мной у човене плыве.
Я ад гора ў грыбы пайшла,
Гора за мной кошык нясе.
Я ад гора ў магілу пайшла,
Гора за мной лапату нясе.

Замест іх з'явіліся бадзёрыя песні, легенды і казкі, у якіх працоўныя Беларускай ССР славяць геніяльных правадыроў комунізма Леніна і Сталіна, стваральнікаў беларускай дзяржаўнасці, якія вывелі беларускі народ на шырокую шчаслівую дарогу.

Шырокую дарожаньку,
Ленін пралажыў,
Пастройку дарожанькі
Сталін завяршыў.

(«Дарожанька»).

Ленін—Сталін далі
Усім народам зямлі
Жыццё светлае
Ды заможнае.

(«Як крыніца пячэ...»)

Пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна, беларускі народ адбудаваў сваю гаспадарку. Беларуская ССР ператворана ў індустрыяльна-калгасную ордэнаносную рэспубліку. Пабудаваныя за годы сталінскіх пяцігодак гіганты прамысловасці, як Магілеўская фабрыка штучнага шоўку, Віцебская швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі», Касцюковіцкі шклозавод і шмат іншых, маюць усесаюзнае значэнне.

Непазнавальнай стала наша сельская гаспадарка. На шырокіх калгасных нівах, на трактарах і камбайнах, горда ўзняўшы галаву, працуюць новыя людзі.

Дзякуючы ўвазе і клопатам комуністычнай партыі і яе правадыроў Леніна і Сталіна, Беларуская ССР стала культурнай краінай, у якой шырока развіваюцца літаратура, навукі і мастацтва

За годы рэвалюцыі ў Беларускай ССР выраслі стаханаўцы прамысловасці: Рушко, Скабло, Кавалёў, Фельдман; стаханаўцы сельскай гаспадаркі: Батоўкін, Значонак, Панкова, Соф'я Рачок; людзі навукі, літаратуры і мастацтва: Голуб, Морзон, Александроўская, А. Ільінскі, Уладамірскі, Купала, Колас, Бядуля, Лынькоў, Броўка, Глебка, Азгур, Пашкевіч і шмат іншых, якімі па праву ганарыцца совецкі народ.

Комуністычная партыя і асабіста таварыш Сталін дапамаглі беларускаму народу выявіць і знішчыць нацыянал-фашысцкія банды, трацкісцка-бухарынскія змяіныя гнёзды, гэтых вырадкаў роду чалавечага, якія хацелі рэстаўрыраваць у СССР капіталізм, вярнуць у няволю вызвалены народ.

Партыя Леніна—Сталіна ўзброіла народы Совецкага Саюза велізарнейшай зброяй — «Гісторыяй ВКП(б)»,—энцыклапедыяй марксізма-ленінізма, вывучэнне якой дапаможа ў далейшай барацьбе за пабудову комуністычнага грамадства.

XVIII з'езд ВКП(б) падагуліўшы велізарнейшыя перамогі пабудовы соцыялізма ў СССР, вызначыў далейшыя шляхі ў справе пабудовы комунізма. Беларускі народ, як і ўсе народы Совецкага Саюза, працуе над выкананнем трэцяй сталінскай пяцігодкі над ажыццяўленнем пастаўленых XVIII з'ездам ВКП(б) гістарычных задач.

Узброіўшыся ведамі марксізма-ленінізма, пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна, беларускі народ разам з другімі народамі вядзе барацьбу за пабудову комунізма.

Беларуская ССР была, ёсць і будзе надзейным фарпостам на заходніх рубяжах вялікага СССР.

Няхай жыве Беларуская ССР!
Няхай жыве беларускі народ!
Няхай жыве вялікі рускі народ!
Няхай жыве сталінская дружба народаў!

Няхай жыве натхніцель нашых перамог, правадыр комунізма, родны, любімы, вялікі Сталін!

НОВЫЯ ТВОРЫ

Пятро ГЛЕБКА

У разведку

Урывак з п'есы „Над Бярозай-ракой"

Станцыя Прыяміна. Штаб чырвонаармейскай часці. У штабе Серго Орджанікідзе і Нічыпар Мелях.

Серго
Нічыпар Мелях, дай мне, брат, Смаленск.

Мелях
Я слухаю, таварыш камісар.

Серго
Калі разведка нам удасца сёння,
Дык мы, Серго, Барысаў забярэм.

Мелях
Смаленск вас слухае.

Серго
Іду, іду.
Смаленск? З Прыяміна. Орджанікідзе.
Таварыш Сталін там? Паклікаць можна?
Мне вельмі спешна. Добра, я чакаю.
(Сам сабе): Найлепш —
усё праверыць самаму,
Так будзе пэўна больш.

(Па тэлефону):
Таварыш Сталін?
Даруйце мне, што я вас патрывожыў.
Здагадкі вашы правільныя. Што?
Здаецца, што на гэты бок Бярозы
Іх перайшло не вельмі многа. Колькі?
Разведка блытае, гавораць розна.
Я пасылаю новую разведку.
Хто павядзе яе? Таварыш Сталін,
Начальніка яшчэ я не прызначыў.
Тут ёсць адзін надзейны чалавек.
Як прозвішча? Баюся вам сказаць,
Таму што гэта покуль-што няпэўна.
Не можа гэта быць? Што, што? Я сам?
Не, не, я не збіраюся. Ды што вы!
У крайнім выпадку, калі нікога
Не будзе іншага, тады — магчыма.
Не дазваляеце? Таварыш Сталін,
Я правяду іх толькі да акопаў.
Ну, можа там яшчэ вярсты са дзве.
Не, не, я буду асцярожны, буду.
Так. Так. Таварыш Сталін, запэўняю,
Што лепш загінем мы ў няроўнай бітве,
А часці партыі не зганьбім адступленнем.
Бывайце, дзякую за клопат і парады.

(Уваходзіць камбрыг Баяновіч).

Баяновіч
Народ сабраўся.

Серго
Пазаві, пачнем.

(У пакой заходзяць камандзіры і палітработнікі. Сярод іх Грыгор Кузьмін, Іван Чаркас, Макарэнка і іншыя).

Галасы
Дзень добры! Добры дзень!

Серго
Вітаю вас.
І ты, Кузьмін?

Кузьмін
Таварыш камісар...

Серго
Хто вам дазволіў выйсці з лазарэта?
Кантужаны, ледзь-ледзь жывы—і ён!
Ну, і характар!

Кузьмін
Гэткі, як у вас.

Серго
Прабач, я хворы ваяваць не лезу.

Кузьмін
А помніце, як на Каўказе вы...

Серго
Даволі, тут не вечар успамінаў!
Калі прышоў ужо—вядзі лепш сход.
Сябры, мяне паслаў таварыш Сталін
І наказаў узяць назад Барысаў.
Звяртаюся да вас: дапамажыце.
Усе магчымасці на гэта ёсць.
Барысаў здраднікі здалі без бою.
А хіба гэта нам не ганьба?

Кузьмін
Ганьба!

Серго
Яшчэ якая ганьба! Гэта верна.
А вы-ж сыны рабочых і сялян.
Якое-ж права маеце вы так...
Так па-чыноўніцку глядзець на гэта?
У чым уся бяда?

Чаркас
У дысцыпліне.

Штабіст
Калі не ведаеш, дык памаўчы.

Серго
Ты як, ты як сказаў яму? Ты хто?

Штабіст
Член партыі, работнік штаба батальёна.

Серго
На фронт! На лінію! Папробуй ваяваць,
Тады і гавары.

Кузьмін
Ёсць прапанова
Паслаць на фронт работніка са штаба.
Хто хоча слова ўзяць? Таварыш камісар,
Таварыш не благі ў нас комуніст.

Серго
Не ведаю. А добры комуніст
Нядрэнным будзе і ваякам. Пойдзеш?

Штабіст
Пайду.

Серго
Ну, вось і добра. Паваюеш,
Павучышся і будзеш камандзірам.
Без дысцыпліны-ж нельга ваяваць.
Асноўнае—наладзіць скрозь парадак,
Узняць настрой байцоў, даць зразумець,
Што за Барысаў трэба зверскі біцца.
Дзянікін з поўдня рушыць на Маскву,
Патрэбна кінуць сілы ўсе туды,
Каб развязаць для гэтага нам рукі,
Каб утрымаць Калінкавічы, Гомель,
Цэнтральныя вузлы ад поўдня на Маскву—
Спыніць палякаў трэба на Бярозе.
Таварыш Сталін загадаў сказаць:
Бяроза ёсць апошні наш рубеж,
З якога адыход на крок—злачынства.
План аперацыі дадзім вам после.
Аднак, здаецца, наступаць пачнем
Ад поўначы і поўдня, з двух бакоў.
Паны ў мяшку не высядзяць і дня.
Як не ваенны, думаю, што так.

Чаркас
Ну, добры не ваенны, а, глядзі,
Бярэ як след, пад самае рабро.

Серго
Як вы, таварыш Баяновіч, а?

Баяновіч
Я думаю, што верна.

Серго
Значыць, можна
Узяць Барысаў?

Баяновіч
Можна.

Серго
Вельмі добра!
Нарэшце мы дамовіліся з вамі.
Таварышы, цяпер ідзіце ў часці.
Збярыце ўсіх байцоў і раскажыце,
За што, чаго і як нам наступаць.
Заданне здзейсніце—хвала і часць,
Як і належыць смелым змагарам.
Не здзейсніце — крыўдуйце на сябе:
Няслава будзе вам і ганьба век.
Дык што-ж сказаць, калі спытае Сталін?

Галасы
Скажыце, што жыцця не пашкадуем.
Памром, але Барысаў будзе наш.

Серго
Тады — усё, таварышы, ідзіце.

(Усе расходзяцца).

Ты, Макарэнка, з хлопцамі застанься.
Пакліч сюды людзей з атрада, Мелях.
Таварышы, я вас усіх паклікаў
Для вельмі важнай і адказнай справы.
Мы пойдзем з вамі ў глыбокі тыл.
Калі хто сумняваецца, баіцца,
Хай не ідзе, не замінае нам.
Такія ёсць? Няма? Цудоўна! Добра!
А вы сягоння елі?

Галасы
Елі.

Серго
Добра.
Вінтоўкі ў спраўнасці? Патроны ёсць?

(Правярае вінтоўкі, падсумкі).

Макарэнка
Усё, таварыш камісар, як след.
Мы самі правяралі.

Серго
Малайцы!

(Уваходзіць Штэйнар, Тацяна і Валошын)

Серго
Ну, як паспалі? Адпачылі трохі?

Сімха
Што адпачыць, дык адпачылі добра,
А спаць, таварыш камісар, не вельмі...

Серго
Чаму?

Сімха
Не спіцца штосьці, камісар.

Тацяна
Прачнуліся і гутарым аб вас.

Серго
Што-ж я такая за выдатнасць тут,
Каб гаварыць пра гэта? Вельмі дрэнна.

Сімха
Таварыш камісар, яна не так сказала.

Серго
Ну, што-ж, сябры, крыўдуйце на сябе,
Калі не выспаліся. Зараз нам
Вялікая прадбачыцца работа.
Мне трэба ваш тутэйшы чалавек,
Які мяне правёў-бы ў Барысаў.
Хто добра ведае дарогу з вас?

Тацяна
Я тысячу разоў туды хадзіла.

Валошын
Дык я тады — дзесяткі тысяч раз.

Сімха
А я сказаў-бы вам, таварыш камісар,
Дык не магу і падлічыць дакладна.
Я балаголам трыццаць восем год.
Памножце іх на трыста з лішнім дзён,
Пасля яшчэ памножце на чатыры,
І мы даведаемся, колькі раз
Праехаў я барысаўскай дарогай.

Серго
Я мушу вам сказаць, што мы ідзем
У вельмі небяспечную дарогу,
У тыл. Вы зразумейце гэта, Штэйнар.

Сімха
За вамі я пайду хоць у Варшаву.

Серго
Тады вы заставайцеся, сябры,
І падрыхтуйцеся сустрэць людзей.
Мы ваш атрад далучым да палка.
А мы не будзем, хлопцы, траціць часу.
Ноч цёмная, якраз нам на руку.
Бывайце, дарагія.

Валошын
Добры шлях!

Тацяна
Шчаслівай вам дарогі!

Серго
Ну, пашлі.
Смялей наперад, будучыня—наша!

(Усе, апрача Тацяны і Валошына, выходзяць).

Валошын
А ноч, як дзёгаць, не відаць нічога.

Тацяна
І дождж ліе...

Валошын
Адважны чалавек!

Тацяна
Такіх людзей на свеце, мусіць, мала.

Як мы рыхтуемся да дэкады

Вярнуўшыся з летняга адпачынку, Менскі Дзяржаўны Беларускі драматычны тэатр прыступіў к падрыхтоўцы да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

Прафесарам-ордэнаносцам, артыстам МХАТ І. М. Раеўскім, сумесна з творчым актывам тэатра, прагледжаны намечаныя для паказу на дэкадзе спектаклі: «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка, «Партызаны» К. Крапівы, «Апошнія» М. Горкага і распрацаваны дакладны план рэжысёрскай і акторскай перапрацоўкі гэтых спектакляў. Зроблена пераразмеркаванне роляў, зменен рад выканаўцаў. У п'есе «Партызаны» К. Крапівы ролю кіраўніка партызанскага атрада, матроса Данілы Дрыля будзе выконваць нар. арт. БССР В. І. Уладамірскі, пана Яндрыхоўскага — засл. арт. БССР С. С. Бірыла, пані Яндрыхоўскай — засл. арт. БССР Л. І. Ржэцкая і О. В. Галіна, ксяндза — засл. арт. БССР Г. Ю. Грыгоніс.

Для ўсіх дэкадных спектакляў робяцца новыя дэкарацыйныя афармленні, з разлiку на сцэну філіала МХАТ. Прагледжаны новыя эскізы мастака Барыса Малкіна для п'есы «Партызаны» і мастака Д. Уласюка для п'есы «Апошнія». Запрошана з Масквы мастак тав. Е. А. Коргіна для выканання работ па перааформленню спектакляў і кансультацыі.

Адначасова з перапрацоўкай старых спектакляў пачаліся рэпетыцыі новай камедыі К. Крапівы «Хто смяецца апошнім» (пастаноўка Л. Рахленка, мастак В. Шкляеў, кансультыруе пастаноўку І. М. Раеўскі).

Пасля літаратурнай дапрацоўкі будзе аднаўлен спектакль «Бацькаўшчына» К. Чорнага. Новае мастацкае афармленне зроблена мастаком Д. І. Уласюком.

Чарговая пастаноўка тэатра — «Рамео і Джульета» В. Шэкспіра ў перакладзе К. Крапівы. Ставіць гэты спектакль будзе прыняты ў склад тэатра на сталую рэжысёрскую работу В. Я. Галаўчынер.

Тэатр папаўняе новымі дасканалымі прыладамі сваё тэхнічнае абсталяванне. Закуплена светлавая апаратура. Набыты вельмі цікавы гука-шумавы апарат, які дае магчымасць узнаўляць на сцэне розныя гукі і шумы.

Пачата работа па напісанню спецыяльнай дэкаднай брашуры, у якую ўвойдуць: кароткі гістарычны нарыс аб творчым шляху тэатра, лібрэта п'ес, цікавыя архіўныя дакументы, фотаздымкі і інш.

Таксама пачалася падрыхтоўка фотавыстаўкі для дэкады, на якой, на спецыяльных мастацка выкананых вітрынах, будуць выстаўлены фотаздымкі гістарычнага шляху тэатра, найбольш значных яго пастановак, творчых работнікаў тэатра і беларускіх драматургаў.

Е. РАМАНОВІЧ.



«Настрычнік на Беларусі». Фрыз работы В. Волкава для Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве.

Фотахроніка БЕЛТА



НА ПАСЯДЖЭННІ ЎРАДАВАЙ КАМІСІІ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ДЭКАДЫ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА Ў МАСКВЕ

8 ліпеня ў Соўнаркоме БССР адбылося пасяджэнне ўрадавай камісіі па падрыхтоўцы да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

На пасяджэнні выступалі з дакладамі аб стане падрыхтоўкі да дэкады кіраўнікі мастацкіх устаноў БССР: тав. Ганцман (Тэатр оперы і балета), тав. Алер (Белдзяржрдрамтэатр), тав. Прагін (Белдзяржфілармонія) і тав. Рубенчык (Дом народнай творчасці).

Не глядзячы на запэўненні ўсіх дакладчыкаў, што пастаўленыя перад мастацкімі ўстановамі задачы будуць выкананы, ва ўсіх іх заўважалася няўпэўненасць у шэрагу момантаў арганізацыйнага парадку.

У спрэчках па дакладах прынялі ўдзел: тав. Кучар, які зазначыў, што тэмпы падрыхтоўкі да дэкады слабыя, у выніку чаго спектаклі будуць гатовы толькі к самай дэкадзе, і не будзе магчымасці праверыць іх на гледачу.

У плане Дзяржфілармоніі няма яркіх, папулярных песень, любімых народам.

Тав. Броўка ў сваім выказванні звярнуў увагу на недапушчальнасць шматлікіх пераробак і змен, праз якія прыходзіцца праходзіць кожнаму твору, які рыхтуецца да дэкады і лічыць, што гэта з'яўляецца вынікам адсутнасці пэўнага аўтарытэтнага погляду, які падпарадкоўваў-бы сабе іншыя.

Тав. Глебка ўказвае на адсутнасць цвёрдай рукі ў кіраўніцтве падрыхтоўкай да дэкады. Няма таксама патрэбнай напружанасці ў рабоце ССПБ, аб чым сведчыць такі факт, што песні, прадстаўленыя ўрадавай камісіі, у ССПБ не абмяркоўваліся. І ў заключэнне тав. Глебка абяцае напісаць некалькі песень.

Тав. Шнейдэрман, спыняючыся на рабоце над операй «Міхась Падгорны» зазначае, што ні адзін твор не можа вытрымаць бясконцага ліку пераробак і паправак, каб гэта не пагоршыла яго мастацкай якасці.

Тав. Багатыроў выказаў думку, што ёсць шэраг арганізацыйных дробязей, якія могуць вельмі сур'ёзна адбіцца на падрыхтоўцы да дэкады, а нават і часткова сарваць некаторыя мерапрыемствы. У Філармоніі няма сувязі з Саюзам кампазітараў. Лепшыя творы кампазітараў не ўключаны ў праграму заключнага вечара дэкады.

Тав. Крошнер выказаўся за неабходнасць найхутчэйшага ўкамплектавання аркестра Тэатра оперы і балета. Ён лічыць неабходным скарыстаць вопыт падрыхтоўкі да дэкад у братніх рэспубліках, гаворыць аб малай сувязі паміж Саюзам пісьменнікаў і кампазітарамі.

Тав. Рахленка зварачвае ўвагу ўрадавай камісіі на адсутнасць напружанасці ў рабоце па падрыхтоўцы да дэкады. Лічыць, што філармонія ігнарыруе скарбніцы народнага фальклору. Значную частку сваёй прамовы тав. Рахленка прысвяціў пытанню адсутнасці даверʼя да беларускіх мастацкіх кадраў. Лічыць, што ў кіраўніцтве падрыхтоўкай да дэкады адсутнічае цвёрдая рука і занадта многа размоў і мала работы.

Тав. Раеўскі, канстатуючы тэхнічную ўбогасць пастановачных сродкаў беларускіх тэатраў, паставіў перад урадавай камісіяй пытанне аб палепшанні гэтага боку справы. Кажучы аб падрыхтоўчай рабоце Дзяржрдрамтэатра зазначае, што перад гэтым калектывам стаіць вялікая задача— стварэнне адзінага творчага метаду. І толькі дасягнуўшы гэтага, тэатр здолее адказаць на тыя вялікія мастацкія запатрабаванні, якія перад ім паставіць глядач на дэкадзе.

Тав. Озірскі лічыць, што дэкада можа закончыцца паспяхова толькі пры ўмове ўдзелу ўсёй совецкай грамадскасці рэспублікі, пры ўзаемнай дапамозе ўсіх творчых калектываў—удзельнікаў дэкады. У заключэнне ён выказвае думку аб неабходнасці раду рашэнняў аб фондах і будаўніцтве тэатраў.

Закончылася пасяджэнне камісіі выступленнем старшыні СНК БССР тав. Кісялёва.

Тав. Кісялёў, гаворачы аб мэтах і значэнні дэкады, падкрэслівае патрэбу сур'ёзнага падыходу да падрыхтоўкі к дэкадзе.

«Падрыхтоўка ідзе павольнымі тэмпамі, мы яшчэ раскачваемся. У нас думаюць, што тэрмін дэкады можна адсунуць. Дарэмна! Тэрмін дэкады ўстаноўлен — студзень», — кажа тав. Кісялёў.

Далей тав. Кісялёў гаворыць аб вялікай адказнасці кожнага ўдзельніка дэкады, аб патрэбе моцнага кіруючага штаба на чале з добрым кіраўніком.

Кіраўнікі мастацкіх устаноў многа гавораць, турбуюцца, але ў сябе пад носам не заўважаюць шмат арганізацыйных дробязей. Можна да бясконца перарабляць літаратурны твор і таму патрэбен аўтарытэтны цэнтр, які вырашыў-бы гэтыя пытанні канчаткова і без зацяжак, каб оперы як найхутчэй ішлі да гледача.

Філармонія павінна ва ўсёй прыгожасці паказаць усё, што ёсць лепшага ў беларускім фальклоры. Але ў філармоніі няма добрага мастацкага кіраўніцтва. Далей тав. Кісялёў спыняецца на значнай дапамозе, якую робяць у справе ўзняцця беларускай культуры таварышы, якія прыехалі з Масквы і іншых гарадоў.

У заключэнне тав. Кісялёў яшчэ раз падкрэслівае, што не глядзячы на тое, што патрабаванні будуць выключна высокія, тэрміны застаюцца тэрмінамі. Дэкада адбудзецца ў студзені 1940 года.

Падрыхтоўку праекта пастановы пасяджэнне даручыла тав. Кісялёву і Озірскаму.

М. І.

КУРСЫ-КАНФЕРЭНЦЫІ ПАЧЫНАЮЧЫХ ПІСЬМЕННІКАЎ

15 ліпеня пачынаюцца курсы-канферэнцыі маладых аўтароў, якія склікаюцца праўленнем ССПБ. Работа курсаў працягнецца месяц.

Сярод запрошаных на курсы пачынаючыя паэты Дзергай, Глікін, Хадарэнка, Кавалёў, празаікі — У. Мурашка, Зміцерэнка, Камейша; крытыкі Лазар, Станкевіч і інш.

З курсантамі будуць праведзены гутаркі аб класічнай і сучаснай рускай і заходне-еўрапейскай літаратуры, аб творчасці беларускіх пісьменнікаў, аб музыцы і выяўленчым мастацтве. Заняткі з курсантамі будуць праводзіць пісьменнікі З. Бядуля, П. Броўка, П. Глебка, М. Лынькоў, К. Крапіва; крытыкі — Клімковіч, Модэль, Бярозкін, Маслоўскі, Юдэлевіч, Кучар і інш.

Курсанты наведаюць спектаклі тэатра імя Ленсовета, музей Рэвалюцыі, гістарычны музей, Дом І з'езда РСДРП, майстэрні скульптараў і жывапісцаў.

К.

У БЕЛДЗЯРЖДРАМТЭАТРЫ

Вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» выклікала вялікую палітычную актыўнасць сярод мастацкай інтэлігенцыі Менскага Дзяржаўнага Беларускага драматычнага тэатра.

Рад акцёраў тэатра прыняты ў кандыдаты партыі. Сярод іх: народны артыст БССР В. Уладамірскі, засл. арт. БССР тт. Л. Рахленка, С. Бірыла, артысты Б. Янпольскі, С. Глікман, Ю. Пушкевіч.

Рад маладых акцёраў падалі заявы ў члены ВЛКСМ.

Р.

БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЖЫВАПІС

Гераічная барацьба беларускага народа з белапольскімі інтэрвентамі з'яўляецца адной з хвалюючых тэм гістарычнага жывапісу. Многія нашы мастакі працавалі і працягваюць працаваць над гэтай тэмай, удасканальваючы свае майстэрства і разуменне гістарычнай карціны, якая па характару свайму павінна абагульняць гістарычны матэрыял, паказваць гістарычны факт не толькі сам па сабе, але і раскрываць праз гэты факт ідэйную гістарычную з'яву. У рускім гістарычным жывапісе вялікім майстрам такога абагульнення гістарычнага матэрыялу і выяўлення ролі народных мас, як рашаючай сілы ў гісторыі самога народа, быў В. І. Сурыкаў. Беларускі гістарычны жывапіс яшчэ не мае буйных майстроў, наколькі такі жывапіс у нас толькі зараджаецца, але бясспрэчна, што кадры майстроў гістарычнага жывапісу ў нас растуць.

З ліку лепшых работ, прысвечаных барацьбе беларускага народа з белапалякамі, варта адзначыць карціну В. Волкава «Партызаны» У гэтай карціне Волкаў паказвае партызанскі атрад у момант падрыхтоўкі гэтым атрадам нападу на белапалякаў. Зіма. Ноч. Партызаны ля агню. Павярнуўся разведчык. Магчыма гэта сялянскі хлапец з суседняй вёскі, які з'явіўся да партызанаў, каб апавясціць аб толькі-што прыбыўшых у вёску атрадзе белапалякаў. Поўсагнутая, напружаная фігура камандзіра партызанскага атрада паказана на фоне трывожных водбліскаў ад агню. Камандзір выслухоўвае разведчыка і адначасова абдумвае рашэнне. Становішча баявой трывогі перадаецца ўсяму атраду—партызаны рыхтуюцца да выступлення.

Мастак П. Гаўрыленка напісаў карціну «У засадзе». На гэтай карціне мы бачым партызан у лесе ля кулямёта, якія чакаюць белапалякаў, што ўжо паказаліся на дарозе ў глыбіні лесу. Мастак К. Гедда ў адной з сваіх батальных карцін паказаў разгром белапалякаў будзёнаўскай арміяй. Мастак Е. Ціханович у карціне «Одважнікі(?) ў разведцы» адлюстраваў адзін з хвалюючых момантаў барацьбы за горад Барысаў, калі Серго Орджанікідзе з невялікім атрадам хадзіў у разведку ў тыл белапалякаў. Многія нашых мастакоў хвалюе як-бы фінальная тэма гэтай барацьбы — уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск і радасная сустрэча яе насельніцтвам горада. Гэтай тэме прысвяцілі свае работы беларускія мастакі І. Ахрэмчык, М. Манасзон і Н. Гусеў.

Беларускі народ свята паважае памяць аб лепшых сваіх сынах, якія загінулі ў барацьбе з белапольскімі інтэрвентамі. Памяць аб гэтых героях, што змагаліся за справу Леніна — Сталіна, у сэрцы беларускага народа заўсёды пераклікаецца з пачуццём глыбокай любві да вялікага арганізатара і натхніцеля перамог савецкага народа над белапольскімі і іншымі інтэрвентамі — да вялікага Леніна. Гэтую ідэю барацьбы беларускага народа за сваю свабодную дзяржаўнасць і кіруючую ролю ў гэтай барацьбе вялікага Леніна добра выразіў беларускі скульптар А. Бембель у помніку Леніну ў Полацку. Кампазіцыю помніка складаюць скульптуры ўзброеных і ідучых у бой матроса і чырвонаармейца і манументальны барэльеф на тэму барацьбы беларускага народа з белапалякамі. Кампазіцыя ўвенчана скульптурай Леніна, які гаворыць прамову і заклікае савецкі народ да барацьбы з інтэрвентамі. У апошні час цікавы праект помніка ў гонар вызвалення Беларусі ад белапалякаў распрацаваў скульптар А. Глебаў.

Многае ўжо сказана нашымі жывапісцамі і скульптарамі аб гераічнай барацьбе беларускага народа з белапольскімі інтэрвентамі, але ўсё гэта сказанае з'яўляецца пакуль-што пачаткам працы беларускіх мастакоў над гістарычнай тэматыкай у мастацтве. Далейшаму поспеху гэтай надзвычай удзячнай працы будуць у вялікай меры спрыяць ажыццяўляемыя зараз беларускімі мастакамі карціны і скульптуры да выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Адбыўшаяся гэтымі днямі выстаўка эскізных работ паказала, што да XX гадавіны вызвалення Беларусі ад белапалякаў многія беларускія мастакі абяцаюць даць рад поўнакаштоўных гістарычных карцін і скульптурных кампазіцый. Не хапілася-б забягаць наперад, але нам думаецца, што сёння да месца будзе назваць найбольш каштоўныя эскізныя работы нашых мастакоў. Гэта эскізы Е. Зайцава, Н. Пашкевіча і А. Глебава.

З вялікім творчым тэмпераментам, схематызавана(?) і разуменнем гістарычнай праўды мастак Н. Пашкевіч паказвае ў сваім эскізе сустрэчу таварыша Сталіна з беларускімі чырвонымі партызанамі ў штабе Рэвваенсавета Заходняга фронта. Ужо ў эскізе мастаку ў значнай меры ўдалося знайсці цікавую характарыстыку вобразаў, з вялікай цеплынёй перадаць вобразы таварышоў Сталіна і Орджанікідзе, якія гутараць з беларускімі партызанамі. Гэта кампазіцыя вялікага гістарычнага абагульнення. Яна паказвае ролю таварыша Сталіна як збіральніка і арганізатара сіл рэвалюцыі для барацьбы і перамогі над ворагамі.

Скульптар А. Глебаў у коннай групе «Таварышы Варашылаў, Будзённы і Шчадзенка на Паўднёва-заходнім фронце» паказвае гераічных кіраўнікоў Першай Коннай арміі ў момант прарыву ёю белапольскага фронта. Скульптару ўдалося перамагчы ўнутраную замкнутасць кампазіцыі. За гэтымі скачучымі на магутных конях кіраўнікамі вы адчуваеце ллючуюся несакрушальнай лавінай конную армію, якая змятае са свайго шляху белапольскіх інтэрвентаў.

Мастак Е. Зайцаў смела ўзяўся за тэму «Уступленне Чырвонай Арміі ў Менск».

У напісаных да гэтага часу беларускімі мастакамі карцінах сустрэча Чырвонай арміі працоўнымі Менска зводзілася, галоўным чынам, да вонкавага, псіхалагічна неглыбокага паказу сустрэчы. Е. Зайцаў-же, як гэта відаць па эскізу, імкнецца ствараць глыбока псіхалагічную гістарычную карціну, паказаць у ёй не простую радасць сустрэчы, але раскрыць праз гэту сустрэчу якасна новы змест як самой Чырвонай Арміі, так і савецкага народа.

Вобразы чырвонаармейцаў, створаных Зайцавым, поўны вялікай унутранай сілы, яны як-бы яшчэ авеяны дымам і порахам гарачых баёў з белапалякамі на подступах да Менска.

Можна не сумнявацца, што беларускія мастакі адлюструюць у жывапісу і скульптуры найбольш яркія старонкі з гісторыі беларускага народа, які на працягу многіх вякоў разам з рускім і украінскім народамі адбіваў арміі інтэрвентаў з Захаду.

А. ДАЛІН.

А. МАРЦІНОВІЧ

ЛЮБОЎ і нянавісць

Скрып саней не варушыць нямой цішыні.
Зоры крадуцца ў вокны пакоя.
Жоўты месяц спакойна плыве ў вышыні,
Толькі я не знаходжу спакою.
Ные сэрца ў тузе, і на вочы мае
Навалока слязы наплывае.
Бліска поўнач. На седале певень пяе
І рапто́ўна ў цішы замаўкае.
Плачу я над сталом. Як мне боль патушыць?
Месяц, месяц, чаму той парою,
Як мой сябра стаяў на заходняй мяжы,
Не свяціў ты над Нёман-ракою.
Ты тады не ўзышоў. Толькі ў небе плылі
Непрыглядныя чорныя хмары...
Гэтай ноччу на варце савецкай зямлі
Быў забіт мой найлепшы таварыш.

Гэта вестка з граніцы прышла да мяне;
Мне не сорамна сёння папла́каць.
Знаю: слёзы народзяць нянавісць і гнеў.

А нянавісць раджае адплату.
Што у сэрцы расце, што вядзе у баю
Церэз горы, даліны і моры...
Я умею любіць і радзіму сваю,
І дзяўчыну, і сябра, і зоры.
Нас яднае любоў у жыцці маладым.
А калі у ліхую часіну
Нам навяжуць вайну, то пазнае тады
Вораг нашай нянавісці сілу!
Мой таварыш загінуў... Не ўстане ён, не...
Нашых песень ён больш не пачуе...
Сціхні, боль, замаўчы! Роспач, прэч ад мяне!
Хай з любоўю нянавісць свабруе!

В. МІСЮН

ШЧАСЦЕ знойдзенае

Я пярсцёнак свой згубіла ў сінім моры.
Гаравала, бедавала ў лютым горы.
Я выходзіла на ганак, і чакала
Свайго шчасця, свайй долі ўсё шукала.
Зоры ясныя ў небе затухалі.
Хмары чорныя мне шчасце закрывалі.
Я хадзіла, я брадзіла дні і годы —
Бушавалі над краінай непагоды.
Дзеткі дробныя ў нястачы паміралі,
Свету, радасці не бачылі, не зналі.
Не знайшла свайго пярсцёнка я у моры—
Век жыла і бедавала ў цяжкім горы.
Дні плылі, за днямі годы праміналі,
Зоры новыя над светам запылалі.
Тыя зоранькі над светам свецяць ясна—
Даў нам радасць, даў нам шчасце лад калгасны.
Сем сыноў растуць на славу, як дубочкі.

Падрастаюць прыгажуні мае дочкі.
Перад імі шлях-дарога ў свет, у людзі.
Хто кім хоча быць ў краіне — тым і будзе.

Вось у небе самалёты заспявалі,
Сем сыноў маіх імкнуцца ў свет, у далі;
Не стрымае іх палёту непагода.
Ім маршрут даў любы Сталін — друг народаў.

А у полі мае дочкі хлеб збіраюць,
Справу Сталіна ўраджаем услаўляюць.
Сонца радасцю ім свеціць днём і ўночы
Не аслепяць над лучынай чорны-вочы.
Зоры ясныя Крамлёўскія зазззялі,
Нам да шчасця шлях-дарогу паказалі.
Я знайшла спакой і шчасце ў гэтым свеце,

Падрастайце вы на славу, мае дзеці.
Вам адчынена дарога ў свет, у людзі;
Аб вас дбае любы, родны—Сталін!

Сяргей ДЗЯРГАЙ

МАСКВА

Жыве Масква! Вясёлкаю
Надзей маіх убрана;
Прываблівая адзолькава
Для беларуса й свана.
Адны шляхі з Масквой у нас —
Дык сустракай як сына —
Аратага і воіна
Сардечна і гасціна.

Любоў давеўшым справаю,
(Масква славам не верыць!)
К табе прышоўшым з славаю —
Раскрыеш насцеж дзверы.
Спявае поўным голасам
Масква, і вецер свежы
Нясе к абодвум полюсам
Удар з крамлёўскай вежы.

Сустрэча артыстаў з рабочымі арцелі

Гэтымі днямі адбылася таварыская сустрэча групы артыстаў тэатра імя Ленсовета, які працаваў у гор. Бабруйску, з членамі арцелі «Чырвоны металіст».

З прывітальнай прамовай ад калектыва тэатра выступіў артыст т. Калашнікаў.

З адказным словам выступілі стаханаўцы арцелі Голанд і інжынер тав. Бярэзоўскі, якія горача дзякавалі артыстаў за сустрэчу з імі і за іх выдатную ігру.

І. Дударчык.



«Акупанты, разбітыя Чырвонай арміяй, уцякаюць з Беларусі». Эскіз мастака Г. Дакальскай. Фота І. Капілінскага.

УДАЧА МАЛАДОГА ПРАЗАІКА

Нядаўна Белдзяржвыдавецтвам выпушчан зборнік апавяданняў Ефіма Садоўскага «Бачу я». Гэты зборнік, не гледзячы на рад яго недахопаў, сведчыць аб творчым росце аўтара, аб перамаганні ім той мастацкай інертнасці, якая адчувалася ў яго ранніх творах.

Апавяданне «Бачу я» — адно з лепшых у зборніку. Яно разлізуе мысль, выказаную Сулейманам Стальскім у пісьме да А. М. Горкага: «Вельмі цікава было-б расказаць аб тым, як атрымліваюць у нашых дні ў нашай краіне сліпыя — зрок, глухія — слых, голыя — шубы, забытыя—кохені, мерзнучыя — сонца, старыя — маладосць». У апавяданні выведзен вобраз сляпога хлопчыка. Цяжкім было яго жыццё да рэвалюцыі. Ён існаваў на падачкі, якія атрымліваў ад розных гаспадароў за непасільную працу. У дні грамадзянскай вайны хлопчыка ўзяла да сябе чырвонаармейская часць. Ён праўляе вялікі гераізм і становіцца любімцам часці. Савецкая ўлада, якая клапоціцца аб кожным чалавеку, вярнула хлопчыку зрок. І першым прадметам, які ён убачыў, быў партрэт правадыра: «Чыйсьці ласкавы, родны твар глядзеў на мяне, дабрадушна ўсміхаючыся, і я сэрцам зразумеў, чый гэты партрэт. Гэтыя родныя рысы я яшчэ ніколі не бачыў, але так прагнуў убачыць.

— Сталін, — усклікнуў я, і хваля бушуючай радасці заліла сэрца...

— Я цяпер бачу!»

У такім-жа плане напісана і апавяданне «Маўчанне». Праўда, якасць апавядання зніжаецца яго незаконічнасцю.

Варта сказаць і аб апавяданні «Бравец Ісак». Перш за ўсё тут кідаецца ў вочы абаяльны вобраз старога яўрэя Ісака, які дапамог чырвонаармейцам спаймаць белапольскага разведчыка. І хаця перавыхаванне, ломка старых перакананняў пад уздзеяннем пролетарскай рэвалюцыі — тэма не новая, але ўсё-ж Е. Садоўскі па-свойму змог аб гэтым сказаць, унёс штосьці свежае, арыгінальнае.

Апавяданне «Сыны» гаворыць аб тыповай савецкай сям'і. Бацькі — калгаснікі, дзеці — байцы Чырвонай Арміі, героі. Яны прыязджаюць дамоў у госці. Іх дружна сустракае калгас, належнае гучанне. Апавяданне вылучаецца жывасцю, ляпне. Апавяданне вылучаецца жывасцю, цяплынёй у абмалёўцы вобразаў, праўдзівасцю адлюстраванне жыцця. Патрыятызм — вось галоўная якасць савецкага чалавека, вось што кіруе яго сямейнасцю. Гэтай мысляй праснякнута ўсё апавяданне.

Значна слабей напісаны астатнія апавяданні ў зборніку. У іх адчуваецца беднасць вымыслу і надуманасць некаторых дэталей. Апавяданне «На пераходзе» не трэба было ўключаць у зборнік. Тэма цікавая, але пашыпцоў(?) да яе Е. Садоўскі не сур'ёзна. Сапраўднага твару дывярсанта аўтару не ўдалося намаляваць. З гэтай тэмай Е. Садоўскі не справіўся.

Няўдалае і апавяданне «Першы сын». Аўтар не змог паказаць таго, што хацеў. Радасць бацькі, які даведаўся аб нараджэнні першага сына, перадана халоднай, беспачуццёвай моваю. А твор «Вахта Савелія Нечая» — хутчэй газетны нарыс, чым апавяданне.

Аб апавяданні «Пытка» няма патрэбы і гаварыць, бо яно поўнасцю складзена з газетных паведамленняў. Жыццё салдат польскай арміі паказана недастаткова. У апавяданні сустракаюцца прабліскі прыгожага гумару, але яны тонуць у шэрасці агульных месц.

У зборніку трапляюцца стылістычныя недаробкі. Нельга, напрыклад, пісаць: «За дзвярыю сталі настойлівей». Што настойлівей: крычаць? стукаць? Частае паўтарэнне слова «но» сведчыць аб недастатковым уменні аўтара пераходзіць ад апісання адной з'явы да другой. На 15 старонцы у васьмі сказах шэсць раз паўторана «но». У развязцы сюжэта нагляданецца(?) хаотычнасць. Аўтар імкнецца апісаць адразу ўсё. Гэта прыводзіць да парушэння мастацкай гармоніі. Адсюль і эпізадычнасць у апавяданнях; некаторыя з іх падобны на канспект вялікага твору.

Наогул-жа трэба сказаць, што пералічаныя недахопы не выключаюць магчымасцей аўтара. Зборнік «Бачу я» — бясспрэчная ўдача Е. Садоўскага.

І. СКАПА.

Хв. ШЫНКЛЕР

НЕ ЗГАСНЕ СОНЦА

Ясная вясновая раніца. Сонца стаіць ужо досыць высока. Паласа цяню спаўзае з бруку і тулішча да ўсходніх сцен камяніц. Горад поўніцца ўжо звычайнай дзённай мітуснёй. І сярод прахожых нічым не вылучаецца сутулая постаць зубраўрачэбнага тэхніка Клёнскага. Няўважны да ўсяго навакольнага, заняты нейкімі сваімі думкамі, ідзе ён роўнай, няспешнай хадою ўскрай заценянага тратуара. Насустрач яму трапляюцца маладыя хлапцы, дзяўчаты. Здаецца: радыя першаму яснаму, цёпламу дню, выйшлі яны сустрэць урачыстасць весны. Ды і што можа даць радасць гэтай моладзі сцісчутага ў лісчах жандармерыі і дэфензівы горада, як не яркае сонца, лагодны подых весны, які абуджае сілы, хвалюе светлымі надзеямі.

І здаецца: то не цьмяныя акуляры паблісквюць у зубаўрачэбнага тэхніка Клёнскага; здаецца: радасць і пяшчотную ласку праменяць вочы гэтага заўсёды знешне бясстраснага чалавека. Можа і так... Чамуж не любавацца Клёнскаму, чаму не радавацца, гледзячы на моладзь — ёй належыць будучае, у ей прыгожае — як гэта сонечная вясна, светлае — як гэты ясны дзень, жыццё наперадзе.

А яны — мілыя юнакі — згубуць гэта жыццё сваімі рукамі. Ведае Клёнскі: сярод гэтых хлапцоў і дзяўчат ёсць камсамольцы. І не толькі сустрэць вясну выйшлі яны сёння на вуліцу. Шмат хто з іх мае дакучанне сачыць за ўсім, што здабываецца ў горадзе. Яны не ведаюць, для чаго гэта патрэбна, — партыйная арганізацыя загадала, значыць сёння належаецца нешта сур'ёзнае. Юнакі не ведаюць і гэтага сутулага чалавека, большасць з іх нават не чула яго імя...

Клёнскі заўважае на процілеглым баку вуліцы скромна апранутага маладога рабочага. Ідзе ён вольнаю хадою бесклапотнага чалавека, шырока размахвае рукамі. Рухавы, ён не застаецца безуважным ні да чаго. Затрымаўся ля вітрыны магазіна — Клёнскі выперадзіў яго. Вось бляявы юнак зноў шпацырую наперадзе, спыніўся, прачытаў аб'яву, зачапіў нейкіх весялух-дзяўчат, пагутарыў, пасмяяўся з імі.

Недзе ля рыначнай плошчы глуха забубнілі барабаны, візгатліва завярашчалі флейты. Наслядоўцы гэтай грымотнай падобны кайзераўскіх рэгіментаў, як і ўсёй іх тупіцаю і зверыныя бы, у вуліцу ўваходзілі пазнанцы. Разведчыкі пасякаючы ботамі, ішоў полк славутай вельканольскай дывізіі. Адбывался чарговая дэманстрацыя магутнасцей войска пана-каменданта Юзефа Пілсудскага. Але не ўражала і не дзівіла спрактыкаваных жыхароў блізкага да фронта горада гэта дэманстрацыя. Была яна для іх красамоўным сведчаннем таго, што там — на фронце войскі панакаменданта нацярпелі чарговую няўдачу.

Шэрыя рады пазнанцаў схавалі бляявага юнака ад Клёнскага. Спыніўся юнак і разам з усімі прахожымі глядзіць на тэатралізаванае шэсце акупантаў. Прайшлі пазнанцы — бляявы юнак зноў апынуўся наперадзе Клёнскага. Ён назват не глянуў у бок сутулага тэхніка. Добра маскіруецца кемлівы хлапец!

Памятае Клёнскі сваю першую сустрэчу з гэтым юнаком. Яны доўга тады гутарылі. Клёнскі быў здаволены тым, што расказаў яму хлапец пра работу падпольнай камсамольскай арганізацыі. Але раптам ўглядзеўся ў субяседніка і заўважыў:

— Дрэнна, Русаловіч... Дрэнна!

Юнак замяшаўся, да таго нечаканы быў канец размовы.

— Ты ходзіш у ботах, — казаў Клёнскі, — так нельга. Ты — малады хлапец, гляне на цябе які «канарак» — палумае: «войск, ці не служыў гэты хлапец у войску, ці не бальшавік ён?» Разумееш? Ты разумееш, якія непрыемнасці могуць узнікнуць з гэтага? Здабудзь башмакі і штаны навыпуск. Раз-жа займіся гэтым!

Русаловіч разгублена агледзеў сябе, і замяшанне яго ўзрастае. Сапраўды: выгляд у яго — не для падпольнай работы.

— Праўда... А я ніколі не падумаў пра гэта...

Клёнскі ўжо ўсміхаецца.

— І не хадзі, хлопча, такім закладочным. Памятай саліднасці. Не да твару яна табе. Будзь жвавым хлапцом... Заліцайся да дзяўчат...

Русаловічава замяшанне зусім знікае, ён весела рагоча.

— Вось так... Імянна так! Весялей!—Клёнскі дадае:—У нашай рабоце вялікае значэнне мае канспірацыя. Сачы за сабой, Русаловіч. Будзь падобны на ўсю юнакоў, нічым не адрозніваючыся ад іх.

Такі быў першы ўрок, атрыманы Русаловічам ад Клёнскага. Ён хутка ўсвоіў яго і, як сёння відаць, зусім не дрэнна.

Клёнскі паварочвае да ціхіх вуліц прыгарада, заселенага рабочымі, саматужнікамі, гарадской беднатой. Русаловіч спішыць хаду, знік з узроку: тут амаль усіх няма прахожых, трэба ісці на адлегласці. Пачалося густое спляценне завулкаў, закавулкаў і проста тупікоў. Хто трапіць першы раз у такі лабірынт, наўрад ці скора выбярэцца на прасторы роўных цэнтральных вуліц. Бывае так, што да якога-небудзь дома можна дайсці з розных, зусім процілеглых закавулкаў. Да аднаго такога дома і накіроўваецца Клёнскі.

Пастукаў умоўным знакам. Яму адчыніў Паўлаў. Чыгуначніку Паўлаву лягчэй было выбірацца з горада і ён выконваў заручэнні арганізацыі па сувязі з ячэйкамі ў павеце. Ён жа сёння і прыняў і дагледзіў гасцей, кожнага з якіх ведаў асабіста.

—Усе ў зборы,—ціха гаварыў Паўлаў, і, хоць усмешка хавалася ў пышных вусах, у голасе яго гучала няўтоеная ўрачыстасць.—Яшчэ ўначы пачалі эбірацца...

— Так... Значыць прыдзе яшчэ адзін — Русаловіч. Я нагледзеў за ім — малайчына. Будзе вам няпрошаная палмога(?) ў раз'ездах. Аднаму цяпер цяжкавата...

Паўлаў адчыніў дзверы ў невялічкі пакой.

— Таварыш Барыс! — гучна прагучаў ён.

Аж стала ўзнялся чалавек пятніццаць мужчын. Названае Паўлавым імя было вядома ім. Але бачылі яны «Барыса» упершыню. Адзін за адным яны падыходзілі да Клёнскага, каб моцна паціснуць яму руку. А ён углядаўся ў твары гэтых мужных людзей, якія з далёкіх вёсках, абмінаючы пасткі жандарскіх пастарунку і воўчых вочаў кулакоў-падпанкаў, рабілі вялікую справу свабоднага(?).

— Сядайце, таварышы... — Клёнскі абвёў уважлівым поглядам прысутных, — былі тут сяляне, бўў адзін чыгуначнік — выхаванец Паўлава, бы некалькі апрануты з большага палясаскому — рабочых пільняў, мыльщыкаў(?) — як ведаў Клёнскі з прывезеных Паўлавым анкет.

— Часу ў нас небагата, таварышы, прыступім да работы... За работай і пазнаёмімся бліжэй. Пакоючую канферэнцыю камуністычнай партыі большэвікоў Літвы і Беларусі абвяшчаю адкрытай!

Глыбокае хваляванне ахапіла прысутных, узнялі з месц. Ледзь чутна, аны заспявалі «Інтэрнацыянал». Натхнёным і страсным заклікам гучаў упорлівага(?) прасіцвання гімн працы і змагання, ім ад гарачых і шчырых сэрцаў. Мужныя рамуцаць спяваўшых змагароў з прыгнятальнікамі і катамі, здаецца, рассоўваюць сцены цеснага пакоя, адчыняюць шырокія далягляды, азначала перад іх узорам пачынальную перамогі.

Дзелавіта, без лішніх слоў, працуе канферэнцыя. Яна абагульняе вопыт арганізацыйнага перыяду работы. Клёнскі пашырае кароткія інфармацыі з месц запытаннямі, ён просіць больш падрабязна гаварыць аб тым, што можа быць скарыстана ў рабоце астатніх ячэек. Асабліву ўвагу адае ён інфармацыі Алеся Пархімовіча, кіраўніка Забічанскай ячэйкі. Гэтая ячэйка арганізавала самы большы ў павеце партызанскі атрад, які нямала клопату прынёс акупантам сваімі адважнымі налётамі на абозы, вайсковыя раздзелы.

—Уліцыце, таварышы чыгуначнік! — гаворыць Клёнскі: — Наш горад паляю(?) ўзялі толькі таму, што перакінулі да яго танкі. Іх прывезлі па чыгунцы. У вас тады не было яшчэ ячэйкі... Цяпер яна ёсць. А па чыгунцы ідуць эшалоны з войскамі, снаражэннем...Ад вас Забічаны недалёка, сувязь з забічанскімі партызанамі дапамога вам выканаць сваю задачу...

Клёнскі падводзіць вынікі праведзенай работы, вызначае задачы на далейшае:

— Сілы сабраны, таварышы! Мы выпрабавалі іх на справе. Цяпер патрэбны рашучыя, масавыя дзеянні. Фронт ажыўся. Палякаў б'юць. Яны падкідаюць новыя сілы. Нам трэба ўзрываць белапольскі тыл, дзейнічаць узгоднена з Чырвонай арміяй. Памятайце: чырвоныя партызаны ў тылу белапалякаў — неад'емная частка Чырвонай арміі, якая змагаецца на фронце...

Клёнскі гаворыць роўна, спакойна. Ён сільны тою сілаю, якая згуртоўвае ўвесь калектыў удзельнікаў канферэнцыі—непахісная вера ў поўную перамогу справы рабочага класа. І ніхто не ведае, што ён гэта вытрымаць чалавек, у якога такія размераныя рухі і чэканныя, узважаныя словы, правёў сёння бяссонную ноч. Ён не спаў, ён хваляваўся, рыхтуючыся да канферэнцыі. Гэта была хваляванне самага радаснага дня ў жыцці.

Работа канферэнцыі падыходзіць ужо к канцу. Раптам пачуўся стук у сенях. Да дзвярэй пайшоў Паўлаў. Стук паўтарыўся. Незнаёмы чалавек стаяў у адчыненых Паўлавым дзвярах.

— Выбачайце, не туды трапіў! — кінуў той і хутка вышаў на вуліцу.

Нечаканае гэта наведванне прымусіла насцеражыцца. Русаловіч адразу вырваўся за наведвальнікам. Канферэнцыя рашыла разыходзіцца. Вярнуўся Русаловіч.

— Ён ледзь не пабег з завулка... Нашы хлопцы перадаюць, што на бліжніх вуліцах з'явіліся жандары...

Напружаная цішыня запанавала ў пакоі. Цішыня роздуму і трывогі.

—Спакойна, таварышы!—узняў руку Клёнскі.—Не хваліцца. Гэта—лішняе у нашай справе... Мы скончылі работу. Выходзіць будзем па аднаму—праз акно. Глядзіце, як ясна свеціць сонца, — ён працягнуў руку да акна, — яно не згасне для нас ніколі—сонца камунізма. Праўда! Мы сёння вызначылі далейшы шлях. Бывайце, таварышы! Першым пойдзе—пазірк Клёнскага спыніўся на Алесю Пархімовічу, — першым пойдзе прадстаўнік Забічанскай ячэйкі. За ім — таварыш з Бароўкі.

Клёнскі адпускаў першымі таварышоў з найбольш моцных ячэек. У гэтую трывожную мінуту ён не забываў аб усёй арганізацыі, ён клапаціўся, каб рашэнні канферэнцыі дайшлі да большага ліку камуністаў, каб не парвалася сувязь з ячэйкамі.

—Русаловіч... — Клёнскі адышоў у кут пакоя.

Русаловіч спехам шаптаў:

—Розаў... Два разы я сустрэў яго ў горадзе, а нядаўна, перадалі хлопцы, ён шнірэль мататуўся недалёка ў праўлёку...

—Розаў? Так... Мае сумненні пацвярджаюцца... Яго, вядома нам, біяграфія не вартая з чыгунцы, потым таварыш з Раптычан(?). Ад дома, таварышы, разыходзьцеся ўсё па тры, пакаўзаў ён да стала і зноў павярнуўся да Русаловіча: — Перад выходам сюды я атрымаў адказ на маё пісьмо. Ён — правакатар...

Яшчэ як прыбыў Розаў у арганізацыю, паводзіны яго здаліся непатуральнымі. Хадзіў ён у старым шынялю рускага ўзору, бравіруючы гэтай сваёй «небояннасцю канарках», любіў калуцца на цвалы ад тлушчу твар яго ўражаў сваёй кагаты(?) Дык стала(?) вадзе зусім пры праўдзе Клёнскі... Розаў трымаў заўсёды...

Ён ветракажа даскадзь Розаў... Розаў у Менску бачыў па часах... Ці не ў Менску бачыў ён Розаў?.. Клёнскі гарачна спрабаваў, што ў Менску ён ніколі не быў.

—Выходзьце, таварыш з Раптычан! Наступны Русаловіч...

Русаловіч умольваюча глядзеў на Клёнскага. Ён хапеў, ён лічыў справам і абавязаных быць з Барысам да канца, разам з ім пакінуць гэты, ужо небяспечны, дом, ісці з Барысам, ахоўваць яго.

— Таварыш Барыс...

— Таварыш Русаловіч... Вы пойдзеце зараз. Слухайце ўважліва...

Гэта «вы» усё растлумачыла Русаловічу. Яго не проста выпрабоўваюць, яму хацелі заданне.

— За лініяй чыгункі, на Махавой вуліцы ёсць магазін чамаданаў Карасіка. Праз дзве-тры гадзіны вы пойдзеце туды. Чамаданы ў яго фанерныя. Вы спытаеце фібравых, карычневага колеру. Карасік вам адкажа, што фібры зараз у горадзе няма. Скажыце: «Я нядаўна прыехаў з Вільні, там ёсць фібра, магу даставіць партыю яе». У вас спытаюць —якой фірмы, — вы скажаце: «Зленчкоўскага». Тады вас запросяць на шклянку чаю. Калі я не буду там,— таму вы раскажаце ўсё, што адбылося сёння і — пра Розава. Выконвайце распараджэнні Карасіка, як мае.

Клёнскі паварнуўся да стала.

— Выходзьце, Русаловіч...

Русаловіч прагна ўглядаўся ў твар Барыса. Клёнскі ўсміхнуўся юнаку сваёй мілай, крыху запучнай(?) усмешкай. Гэта — адзін міг. Працягнуў руку. Русаловіч схапіў яе, парывіста паціснуў. Можа апошні раз... Уарушаны, цяжка ўзыхнуў, накіраваўся да акна.

У пакой увайшоў Паўлаў. Замкнуў дзверы на засаўку і абапёрся аб іх плячма. Усё было зразумела.

Клёнскі выправаў апошніх таварышоў — іх было трое-чатыры, не больш. Яны, як і тыя, што пайшлі перад імі, былі гатовы да вялікай, баявой работы.

Клёнскі ірваў на кавалкі пратакол, разлечаны(?). Складаў абрыўкі на стол і запаліў іх. Хвіліну ўглядаўся, як полымя, чорнай плямай расплываўся агонь па шматках паперы. Падварушыў ix. На вуліцы чуліся ўжо галасы, а неўзабаве раздаўся стук у дзверы сенцаў. Паўлаў ямчэй абапёрся аб дзверы, прыжмурыўшы дужым плячом да філёнкі. Ён глядзеў праз акно ў сад. Вакол блакітных вачэй яго сабралася сеткай дробных змаршчынак. Такія вочы бываюць у разумных, хітрых мужыкоў. ... Ён яшчэ ні разу не бачыў гэтых вачэй і ніколі не хібіць.

Дагаралі паперы. Клёнскі расцірае попел пальцамі.

Галасы чуліся ўжо ў пасенях праваруч... Жандары, выбілі, нахажылі ўжо дзверы...

—Ну, дружа... — Клёнскі паварнуўся да Паўлава, — Зроблена ўсё, што магі мы зрабіць, работа будзе праца. Расшытыя(?) ...

Яны абняліся.

СУСТРЭЧА

Т. ХАДКЕВІЧ

У адзін з летніх дзён на стэпавай станцыі паблізу Канстанцінаўкі на Данбасе, з-пад вагона прышоўшага поезда вылез хлопчык гадоў чатырнаццаці. Быў ён увесь запэцканы сажай, брудны і стомлены. З плячэй звісалі лахманы парванай світкі. Насцярожаны позірк акідваў ваколіцу. Хлопчык адстаў ад кампаніі беспрытульных і цяпер вандраваў адзін па няведаных дарогах. У пошуках ежы ён сышоў з поезда.

Станцыя выглядала пустыннай, прыпіхшай. З бязмежнага стэпу наплывала гарачыня, прасякнутая густым пахам летніх кветак і траў. Некалькі прыезджых пасажыраў прайшлі па перону. Клапатлівы дзяжурны па станцыі адбіў першы званок. У хлопчыка яшчэ быў час, і ён, прамільгнуўшы неўзаметку міма дзяжурнага, вышаў на той бок станцыі. Невялікае сяло раскінулася перад ім. Зусім паблізу на лаўках, пад адкрытым небам стаялі кашыкі з яблыкамі, міскі з гарачымі піражкамі, бутэлькі з малаком. Жанчыны каля іх чакалі пакупнікоў з поезда.

Але не гэты малюнак прывабіў увагу хлопчыка. Ад станцыі міма яго з гулкім шумам праходзілі дзве дзівосныя, ніколі не бачаныя ім, машыны. Гэта былі трактары, выпісаныя з-за мяжы для соўгаса, што знаходзіўся недалёка ад станцыі. Відовішча так захапіла хлопчыка, што ён не заўважыў, як празвінеў апошні званок, запыхкаў поўнымі грудзьмі паравоз, і шэрая істужка поезда знікла за паваротам чыгункі. Хлопчык ішоў побач з машынамі і не спускаў позірка з людзей, што сядзелі на іх.

— Бач ты, які чарнюк, — заўважыў адзін з трактарыстаў.

— Гэй, ты! — крыкнуў другі,—хадзі, падвязу.

— Падвязеш, праўда? — нерашуча прамовіў хлопчык.

— Далібог, не зманю... Залазь...

Хлопчыку здалося, што ён стаў самым шчаслівым на свеце. Прыемна яму было сядзець на машыне побач з чалавекам, які вёў яе. Яны мінулі прывакзальнае сяло і выехалі на шырокую дарогу, што перасякала заліты палымнеючым сонцам стэп. У далечыні на самым ускраі стэпу вырысоўваліся соўгасныя будынкі.

У соўгасе хлопчык нечакана знайшоў бацькоўскую прыветлівасць. Пажылы, рухавы мужчына, што прымаў трактары— не іначай, як дырэктар соўгаса — завёў яго да сябе на кватэру. Пачаставаўшы галоднага госця сытным баршчом і аладкамі ў смятане, ён загаварыў з ім з незвычайнай цеплынёй. Няёмка было не разгаварыцца на гэты раз.

Хлопчыка звалі Лявонам. Далёка адгэтуль на Беларусі ёсць невялікі гарадок. У маленькай хатцы там, на ўскраіне жыла рабочая сям'я. Бацька працаваў шклодувам на гуце, маці даглядала кавалачак гароду і гадавала дваіх дзяцей. Жылі калі з хлебам, калі з бульбай. А тут надыйшла рэвалюцыя, стала куды лягчэй і вальней. Напэўна жыццё пайшло-б яшчэ лепш, каб не вайна.

У гарадок уварваліся белапалякі. Памяць хлопчыка захавала жудасны малюнак пагромаў і пажараў. У першыя-ж дні бацька пайшоў да чырвоных партызан. Помсцячы за гэта, белапалякі спалілі хату і знявечылі маці. Праз дзень маці памерла, і дзяцей падабралі добрыя людзі. Потым, калі прышлі чырвоныя, іх прыгулілі дзетдом, бо ад бацькі не было вестак.

Здарылася так, што Лявона зманілі з дзетдома беспрытульнікі і ён пакінуў маленькую белакурую сястрычку Анэту. Калі-ж праз некалькі месяцаў вярнуўся назад, дык аказалася, што дзетдом кудысьці перавялі, а пра лёс бацькі ніхто не чуў. Тады ён зноў дагнаў сваіх таварышаў і ўжо чацвёрты год не разлучаўся з імі, пакуль выпадак не прывёў яго на гэту стэпавую станцыю.

— Заставайся ў нас, — сказаў дырэктар соўгаса, калі распытаў хлопчыка пра ўсё. — Хочаш быць трактарыстам?

— А не падманіш? — недаверліва запытаў хлопчык.

— Не...

— Глядзі-ж, а то белы свет шырокі, збягу...

З гэтага пачалося новае жыццё хлопчыка, і разгарнулася гэтае жыццё так цудоўна, як нельга было пра яго і марыць. Трактар аказаўся не такой ужо складанай машынай, як думалася спачатку. Але што больш за ўсё радавала — гэта магчымасць вучыцца. У соўгасе існавала вячэрняя школа, і Лявон, злезшы пад вечар з трактара, садзіўся за школьную парту. Паступова знікала цяга да вандроўніцтва: у іншым святле вырысоўваліся раз'езды пад вагонамі, начлегі ў падвалах, напады на базары і крамы. У думках ужо блеклі фарбы беспрытульнай рамантыкі, бо рэчаіснасць вабіла новымі перспектывамі.

У Лявона бясконца расла прагнасць да вучобы. Якім шчасцем запылаў яго твар, калі ён атрымаў з горада станоўчы адказ на сваю заяву аб прыёме яго на рабфак! Асеннім днём ён сабраў маленькі чамадан, горача развітаўся з гасцінным соўгасам і ўпершыню за ўсё сваё жыццё з чыгуначным білетам у кішэні, як поўнапраўны грамадзянін, паехаў на поездзе. Жыццё ўсміхалася яму чаруючай будучыняй.

Хутка мінаў час за вучобай на рабфаку. Некалькі разоў Лявон спрабаваў адшукаць сястру і даведацца пра бацьку, але ці то не даходзілі пісьмы, ці то не адказвалі на іх, — вынікаў не было. Тады, скончыўшы рабфак і перайшоўшы на першы курс інстытута, ён сабраў грошай на дарогу і рашыў з'ездзіць на радзіму. У глыбіні душы нейк прачнулася пачуццё прывязанасці да родных месц, з якімі было звязана столькі горкіх успамінаў. Зразумелым было яго хваляванне, калі поезд праходзіў міма знаёмых з дзяцінства палёў і пералескаў.

Зусім не тым стаў гарадок, якім пакідаў яго Лявон дзесяць год таму назад. Новыя дамы выраслі на месцы руін і папялішчаў. Утульны, нібы знарок прыбраны, паўставаў перад ім гарадок на беразе прасторнай ракі. З вакзала Лявон ішоў па ўзведзенаму нанава масту праз раку. Вунь там на ўзбярэжжы стаяла хаціна бацькі, і гародзік ледзь не даходзіў да берага. Маці выходзіла вечарамі на вуліцу і голасна гукала дзяцей на вячэру... Хаціны не было. Будаўнічая пляцоўка, засыпаная шчэбнем і цэглай, раскідвалася па пустыры, які быў сведкай колішніх белапольскіх зверстваў.

Куды ісці? Старых суседзяў шукаць не было сэнсу: калі і жыў хто з іх на старым месцы, дык наўрад ці помніў звычайнага маленькага хлопчыка, што так даўно знік з горада. Лявон рашыў чайсці на шклозавод. А раптам хто з даўнішніх рабочых чуў пра бацьку. Ды к таму-ж цягнула яшчэ настойлівае жаданне паблукаць па роднаму гарадку. Шклозавод стаяў на водшыбе. У канторы Лявон загаварыў з сівавусым прыземістым чалавекам, што спаткаў яго на парозе кабінета дырэктара. Той уважліва выслухаў і раптам раскінуў рукі.

— Браткі мае... Дык гэта-ж сын Пятра Смольскага!... Ах, ліха на маю галаву!... Бацька цябе шукае колькі год, а ты сабе сядзіш дзесьці і хоць-бы слова пікнуў.

— Антоша! — крыкнуў ён у суседні пакой. — Пакліч ка мне майстра Смольскага. — А ты, — звярнуўся ён да Лявона, — заходзь сюды. Ого, які сын у Пятра Адамавіча!

Бацька не прымусіў доўга чакаць сябе. Разгублены ад хвалявання, ён прыбег, не ведаючы, з чаго пачаць гаворку, як прывітаць сына. За гэты час ён прыкметна пастарэў: сівізна абсыпала голаву і лішнія маршчыны прарэзалі скроні. Яго расказ для Лявона аказаўся незвычайным і разам з тым [illegible] простым. У той памятны год бацька з чырвонымі партызанамі апынуўся ў глыбокім тылу белапалякаў. Толькі праз паўтара года, па сканчэнні вайны, яны вярнуліся адтуль на радзіму.

— А дзе Анэтка? — адразу запытаў Лявон, калі прайшлі першыя хвіліны ўзбуджанай нечаканасці.

— Анэтка не твайго палёту, — з мяккім дакорам сказаў бацька. — Яе я адшукаў хутчэй. У Маскве зараз... Вучыцца на лётчыка... Што ты скажаш?

— Малайчына... А я, татка, пайшоў па твайму шляху... Студэнт інстытута шкляной прамысловасці.


— Чуў? — кіўнуў галавой дырэктару завода Пётр Адамавіч. — Не прапалі дзеці... Шчасце якое...

— Для таго і рэвалюцыя была, — спакойна сказаў дырэктар, — каб мы і нашы дзеці знайшлі шчасце...

Праз некалькі дзён Лявон паехаў на заняткі. Паехаў з тым, каб праз чатыры годы стаць інжынерам.



«Уваход Чырвонай арміі ў Менск». Эскіз мастака Зайцава. Фота І. Каплінскага.



«Дзе сын?» Эскіз мастака Заборава. Фота І. Каплінскага.

Аляксандр ПАРМОН

Астроўскі-Карчагін

У думках, клапотах я лёг у пасцель
Заснуў гэтак прагна, глыбока.
І сніў, што па стэпу, кавыль дзе
расце,
Праходзіць юнак яснавокі.

У стэпу па сцежцы юнак той ідзе
З усмешкай на твары бадзёрым
У шэрым шынелі. Ён повен надзей
І думак глыбокіх, як мора.

Я глянуў раптоўна:
— Дзе бачыў, калі? —
Так доўга стаяў я ў развагах.
І ўрэшце прыпомніў, што гэткім калісь
Байцом быў Астроўскі-Карчагін.

Кавыль рассцілаўся па стэпу, як шоўк,
Ад ветру шумеў, быццам плакаў,
І кветкамі пахла.
Карчагін ішоў
На фронт супроць белапалякаў.
Прачнуўся, гляджу:
Наўкі побач няма!..
Карчагін жыве ў народзе.
Я ў сне яго бачыў, а буду трымаць
У памяці вечна, заўсёды.

ДА КОНКУРСА НА ЛЕПШУЮ ДЗІЦЯЧУЮ П'ЕСУ І ПЕСНЮ

Толькі цяпер, калі абвешчан конкурс на п'есу для школьных гурткоў, я ўпершыню задумаўся над пытаннямі: чаму, сапраўды, да гэтага часу ніхто з нас не падумаў аб такой рэчы? чаму да гэтага часу ніхто не ўзнімаў гэтага пытання? чаму такі конкурс не арганізавалі некалькі год назад? і як гэта мы столькі часу жылі, не маючы бадай-што, ніякіх твораў для школьных пастановак?

Але цяпер ужо не варта дапытвацца, хто вінават. Будзем выпраўляць сваю віну на справе. Конкурс дае значны стымул для гэтага. Мне здаецца, не толькі «дзіцячыя» пісьменнікі, але і «дарослыя» павінны зацікавіцца справай стварэння дзіцячых п'ес і песень. За апошнія два годы, бадай, усе члены нашага саюза паспрабавалі свае сілы ў драматургіі. У даным выпадку гэта вельмі дарэчы. Няхай цяпер усе яны возьмуцца за п'есы для конкурса.

Работа над такімі п'есамі, вядома, мае свае якасці, і значныя: творы павінны быць жывыя, дынамічныя, выхаваўчыя, цікавыя, тэхнічна даступныя, але з другога боку «кароткаметражнасць» іх дае магчымасць патраціць больш часу і ўвагі на адшліфоўку.

Школы і піянерскія атрады чакаюць ад нас, савецкіх пісьменнікаў, высокаякасных п'ес і песень. Створым іх у бліжэйшы час.

Янка МАЎР.

Конкурс на помнік-абеліск дукорскім партызанам

У адзнаку XIX гадавіны вызвалення Беларусі ад белапалякаў Упраўленнем па справах мастацтваў пры СНК БССР аб'яўлен конкурс на лепшы праект помніка-абеліска дукорскім партызанам.

У конкурсе, побач са скульптарамі, якія будуць працаваць на дагаворных пачатках, могуць прыняць удзел усе скульптары рэспублікі.

У журы конкурса ўваходзяць: заслужаныя дзеячы мастацтваў тт. Азгур, Керзін, Грубэ, начальнік ізосектара Генін, мастак Зайцаў.

Праект помніка-абеліска павінен адказваць наступным патрабаванням: у сінтэзе архітэктурных і скульптурных форм манументальна выразіць ідэю гераічнай барацьбы беларускага народа супроць белапольскіх акупантаў.

Для ўзнагароды скульптараў за лепшыя работы вызначаны тры прэміі: 1 прэмія— 3000 руб., 2-я прэмія — 2000 руб., 3-я прэмія — 1000 руб.

М. ПАСЛЯДОВІЧ

ГАНДЛЯРЫ І ГАСПАДАРЫ

«Чым далей у лес, тым больш дроў»— кажа народная прыказка.

Мос'е Пішэгру ў захапленні пазіраў на шэрыя, нібы высечаныя з граніта, ствалы векавых дубоў, на роўныя, як струна, медна-ствольныя сосны. Прарываючыся праз густыя зараснікі арэшніку, абдзіраючы рукі калючымі ажавінамі, ён усё далей і далей забіраўся ў глыб пушчы. Гамулька і Корбут ледзь паспявалі за неўтрапёным французам.

— Аргонскі лес — малышык! — бясконца мармытаў ён, мяшаючы беларускія і рускія словы. — Аргонскі лес — бедны дом супроць гэты манумент! Гдзе відаль такі граб? А дуб? Бог мой, гэта цэлы стандарт!.. О, пан Свянцінкі багач... Такі капітал!..

— Пану Свянціцкаму належыць у гэтай пушчы толькі дзве з паловаю тысячы дзесяцін, — растлумачыў Гамулька.— Астатняе — царскай сям'і. Усяго тутака адзінаццаць тысяч дзесяцін.

— Адзінаццаць тысяч?! — усклікнуў мос'е Пішэгру.

— Адзінаццаць, — прагугнявіў міністр, выціраючы клятчатай хустачкай запацелае шкло акуляраў. — Мос'е Пішэгру будзе з чаго выбраць патрэбны матэрыял.

— О, гэта не лёгкі справа! Ві разумей, што ёсць авіяцыйны стандарт? О-о!.. Такі тонкі, тонкі слой... без адзінага сучок!.. Стандарт з мільён дрэў!.. О!

Ён спрактыкаваным вокам шпарка аглядаў абранае дрэва, потым разы два стукаў палкай па ствалу, прыслухоўваючыся да аднаму яму вядомых гукаў. Корбут моўчкі праслізаў следам за Гамулькам. Ён не ведаў, як умяшацца ў размову гэтых важных паноў, якія так тонка і далікатна ўсміхаліся пры гэтым адзін аднаму, што Корбут, каб яго забілі, не мог-бы так усміхнуцца! Каб не тая ўзнагарода, якую яму абяцаў Свянціцкі за паслугу, Корбут ніколі-б не адважыўся паехаць у пушчу. Ён некалькі разоў баязліва азірнуўшыся, хацеў нешта сказаць Гамульку, але той быў так заняты французам, што зусім не звяртаў увагі на знакі войта.

— Калі мос'е хоча, ён можа купіць увесь гэты лес, — прапанаваў Гамулька французу. — Пан Свянцінкі ўпаўнаважыў мяне правесці гэту справу.

— Увесь лес? — здзівіўся мос'е Пішэгру. — Але нашай фірме патрэбен стандарт...

— Дык то фірма, — перапыніў яго Гамулька. — Калі мос'е ведае законы гандлю, ён можа меркаваць іншым радкам. Задаволена будзе не толькі фірма, але і сам мос'е.

Француз яшчэ няўцямліва паглядзеў на беларускага міністра. Гамулька тады заспяшаўся:

— Гэты лес вы можаце купіць асабіста. Ён вам абойдзецца за поўцаны. Нядорага будзе каштаваць вырубка і вывазка. Свянціцкі наклаў на сялян вялікія штрафы і гэтыя сяляне пагоняцца за кожнай капейкай.

Вочы ў мос'е Пішэгру засвяціліся. Пан міністр сапраўды прапанаваў яму выгодную камерцыю. Навошта служыць гаспадарам, часта за няпэўныя процанты, калі можна самому зрабіцца гаспадаром!

— У Бергене, у Лондане вы атрымаеце поўную цану,—падахвочваў Гамулька. — Калі ў мос'е не хопіць капіталаў, мы можам стварыць кампанію. Я кладу ў гэту справу трыццаць тысяч марак. Пан войт таксама не адмовіцца.

— Божа мой, — цяжка ўздыхнуў Корбут. — Што вы гаворыце. Ды ў мяне няма ні капейкі!.. Якія ў мяне капіталы...

— Але ў пана войта ўлада. Пан войт, калі захоча, можа нават задарам прыгнаць у гэты лес пільшчыкаў і фурманкі...

— Я згодзен, — нарэшце праспяваў француз. — Фірме я адпраўляю авіяцыйны матэрыял, усё астатняе — уласны прыбытак.

— Калі толькі фурманкі і людзі, дык няхай будзе і мая частка, — даў згоду і войт. — Ад гэтых лясоў цяперака адзін толькі неспакой... Непатрэбная вайна...

Торг быў праведзен. Акуляры Гамулькі ўрачыста паблісквалі. Мос'е Пішэгру рушыў цяпер далей з такім імпэтам, што міністр і Корбут, як ні стараліся, усё-ж адсталі.

— Пане! Мусее! — з трывогай у голасе крыкнуў Корбут. — Не ідзіце далей!... Там ужо Бабровыя хаты... Не дай божачка, калі што здарыцца.

Але агент замежнай фірмы не звярнуў увагі на яго папярэджанне. Яму хацелася добра агледзець тое, што купляў. Так, захоплены новай выгоднай справай, ён адзін апынуўся ў гушчары. Ішоў да таго часу, пакуль не пачуў за спіною голас Змітрака Буйневіча:

— Эй, у капялюшыку. Рукі ўгару!

Думаючы, што гэта які-небудзь жарт, мос'е Пішэгру павярнуўся з нязменна прыемнай усмешкай на губах. Але заўважыўшы наведзеную на яго вінтоўку і сурова-пагрозны бляск вачэй гарманіста, адразу пацямнеў і затросся. Нідзе не было Гамулькі, нідзе не было Корбута! Ён стаяў сам-на-сам з невядомым чалавекам у жоўтым кароткім кажуху. Пішэгру быў аглушаны, асьлеплены такою нечаканасцю.

— Кладзіся!—ужо люта крыкнуў Буйневіч і, асцерагаючыся, каб незнаёмы не выхапіў чаго з кішэні і не пачаў супраціўляцца, націснуў на спуск. Гулкае рэха стрэлу громам пакацілася па лесе. Гэты міжнародны жэст аказаўся зразумелым для французскага коміваяжэра. Ён моўчкі чмякнуўся аб зямлю.

Тады стрэліўшы угару для большага страху яшчэ раз, Буйневіч ліхаманкава рынуўся да незнаёмага. Закруціўшы яму на спіну рукі, ён звязаў іх выцягнутым з-пад кажуха поясам. Потым, дастаўшы хустку, скамандаваў, але ўжо лагодным голасам:

— Падымі трошкі галаву. Вось так... Ну, цяпер паспрабуем стаць на ногі... Жжыва, такую тваю маць!.. Зброя ў цябе ёсць?

— Куа? — прамармытаў асьлеплены хусткай мос'е Пішэгру.

— Ты што: нямы? Ці прыкідваешся? Зброя ёсць?

— Куа?

— Кува, кува, — перадражніў Буйневіч француза і пачаў абмацваць яго кішэні. — вось калі прыставім цябе да якога дрэва, тады не так закувакаеш! Ну, марш наперад!

У кішэнях мос'е Пішэгру былі насавая хустка, партманэ і каробка папярос.

Яшчэ вярсты за дзве да смалярні Буйневіча спаткалі партызаны. Устрывожаныя грукатам стрэлаў, яны выскачылі з зямлянак і кінуліся ў бок Бабровых хат. Згледзеўшы цэлага і непашкоджанага Буйневіча, яны паспакайнелі, зацікавіўшыся толькі адным: што за чалавек трапіў у Змітраковы рукі?

— Нічога не гаворыць па-людску, — растлумачыў Змітрок. — Кувакае ды ўсё.

— Паніч нейкі, — уважліва агледзеўшы мос'е Пішэгру ад галавы да ног, — прамовіў Мішка Страмок.—Штаны навыпуск, паліто, капялюшык. І вусікі па аршаўску падстрыжаны... Няўжо ён так і здаўся, без бою?

— І пальцам не варухнуў, — усміхнуўся Буйневіч. — хіба не бачыш, як дрыжыць?

— Небарака... Можа і штаны давядзецца яму мяняць... Асцярожна, паніч, тут пянёк!

Усе партызаны высыпалі з зямлянак. У кажухах і світках, у кучомках і летніх салдацкіх шапках, яны моўчкі чакалі, покуль падыйдзе Змітрок Буйневіч са сваёй здабычай. Віктар перакідваўся нязначнымі словамі з начальнікам штаба.

Палоннага ўвялі ў зямлянку, развязалі хустку. Прамень яркага, але халоднага сонца, прабіўшыся праз невялічкае акенца, ударыў яму ў вочы. Ён хваравіта зморшчыўся і заплюшчыў іх.

— Прозвішча, імя? — ужо грымеў Булынка. — Адкуль з'явіўся?

Француз маўчаў, не разумеючы, відаць, ніводнага слова. Адзін раз ён нават паспрабаваў усміхнуцца, але ўсмешка атрымалася крывая і нагадвала хутчэй грымасу.

— А можа ён грэбуе гаварыць панашаму? — умяшаўся ў допыт Мішка.— Эй, ты, пудзіла, як цябе завуць?

— Куа? — зноў абазваўся француз.

— Во-во! — падхапіў Буйневіч. — Ён, таварыш начштаба, усю дарогу так кувакае. Ён, мусіць, не тутэйшы. Ён не разумее...

—Смальні разок па вуху — тады зразумее, — панура параіў нехта з натоўпу.

Раптам роблена суровы твар Дарафея Булынкі пасвятлеў. Наваліўшыся локцямі на маленькі скрыпучы столік, ён нешта залапатаў таямніча-няўлоўным голасам. Незнаёмы на момант аслупянеў, потым шпарка падаўся да Булынкі. Твар яго аж паласкаўся ад радаснай усмешкі. Незразумелая для партызан гаворка цягнулася больш хвіліны.

— Палонны гаворыць, што ён француз, — нарэшце паведаміў Булынка. — Змітрок, давай сюды яго дакументы.

Буйневіч паклаў на стол знойдзеныя ў кішэнях палоннага рэчы. Булынка адкрыў партманэ і пачаў разглядаць паперы. Не прайшло хвіліны, як ён ускочыў і агледзеў француза з ног да галавы.

— Мос'е Пішэгру? Як вы тут апынуліся?

Француз шпарка залапатаў. Потым схапіў руку Булынкі і пачаў трэсці яе так, нібы Дарафей быў яго вельмі блізкім сваяком, з якім ён спаткаўся пасля доўгай разлукі.

— Мос'е Булынка!.. Друг!..—толькі і чулася ў зямлянцы.

Віктар раптам прыпомніў сваю пакутную ноч на чыгуначнай станцыі, агульны пакой у заездным доме... Тоўстага пана, які піў гарбату. Злосна ссунуўшы калматыя бровы, ён глуха кінуў Булынку:

— А ну, запытайся ў яго... свайго... друга... Чаго ён сюды забраўся?

— Ён купляе лес у пана Свянціцкага, — няёмка вызваляючы сваю руку з учэпістых лап француза, адказаў Булынка. — Гэта агент фірмы «Іспана-Суіза».

— Ён прыехаў у пушчу адзін?

Булынка пераклаў запытанне Віктара на французскую мову.

— Кажа, што з ім былі Корбут і нейкі міністр... Як вы кажаце, яго прозвішча? — перапытаў ён у мос'е Пішэгру.

— Мос'е Гамулька, — не азіраючыся на Віктара, прамовіў француз. — Ён застаўся на месцы. Ён чакае мяне.

— Чакае?! — хрыпла, ужо не адчуваючы, як у неўтрапёнай ярасці, налівaецца крывёю яго твар, крыкнуў Віктар: — Эй, хлопцы, за мною! А ты, Дарафей, трымай тут гэтага салаўя. Выпусціш — адкажаш мне сваёю галавою!

Партызаны рынуліся з зямлянкі. Мос'е Пішэгру зноў ледзь не самлеў ад страху. Усё тут было пагрозным: не толькі ўзброены натоўп, які запоўніў усю зямлянку, але і пустата, якая засталася пасля таго, калі яны выскачылі за тым неўгамаваным хлопцам. Павольна, адчуваючы бязмерную слабасць у нагах, ён асеў на калодку. Дрыглівым, ужо без адзінай усмешкі на твары, голасам мос'е Пішэгру запытаўся ў Булынкі:

— Што вы са мною зробіце? Божа мой, як мне цяжка!

Яны засталіся ў зямлянцы толькі ўдваіх. Папраўляючы кабуру нагана, Булынка адказаў:

— Гэта залежыць ад чалавека, які кінуўся лавіць вашых сяброў. Яго бацьку расстралялі белапалякі...

— Але вы не маеце права! — крыкнуў мос'е Пішэгру ў роспачы.—Я французскі падданы. Я — мірны чалавек. Мне няма справы да вашай барацьбы. У мяне сям'я... Я вам даю клятву, што палкоўнік Свянціцкі ні слова не даб'ецца ад мяне пра тое, што я тут бачыў. Я нічога не хачу ведаць! Я прыехаў толькі купляць лес у пана Свянціцкага...

Булынка не адказваў. Ён нічога не мог абяцаць французу без ведама Віктара. Булынка думаў толькі пра тое, якія неспадзяваныя часамі бываюць сустрэчы з людзьмі.

Так прайшла гадзіна, другая. Раптам дзверы зноў адчыніліся. У зямлянку, разам з халодным патокам паветра, увваліўся Віктар. Твар яго быў стомлены, але вочы гарэлі ўсё тым-жа неспакойным агнём. Француз, агледзеўшы яго, усхапіўся з калоды.

— Давай сюды пратакол допыту, — усё тым-жа настуджаным голасам, прагаварыў Віктар. — А яго сваякоў не злавілі... Уцяклі, сволачы!

Мос'е Пішэгру, агледзеўшы хлапца, аслабеў яшчэ больш. Нешта знаёмае заўважыў ён у яго крыху сутулай постаці, у рухах. Яго ссунутыя калматыя бровы не абяцалі французу нічога добрага.

— Што мы будзем з ім рабіць? — запытаўся Булынка, устаючы.—Мне здаецца, ён чалавек... не вельмі страшны для нас...

Віктар маўчаў, дачытваючы пратакол. Толькі праз хвіліну абазваўся, прыглушваючы кашаль:

— Няхай ідзе. Чорт з ім. Толькі скажы яму, каб не пападаўся больш у нашы рукі. Апынецца тут у другі раз — атрымае кулю ў лоб.

Булынка пераклаў словы Віктара французу. Але той, мусіць, палічыўшы адказ партызана за праяўленне слабасці, ні з таго, ні з сяго пачаў спрэчку.

— Не з'яўляцца ў лес? А хто тады пакрые страты фірмы? Дагавор з панам Свянціцкім падпісан, грошы на рахунак пана Свянціцкага пераведзены. Гэта-ж грабёж!

Правая рука Віктара раптам уздрыганулася і ў пагрознай імклівасці пацягнулася па маўзер. Француз, бялеючы тварам, адступіўся да сцяны і заплюшчыў вочы. Ён ужо вельмі каяўся за свае неабдуманыя словы. Зараз грымне стрэл...

Але хлопец не стрэліў. Задыхаючыся ад ярасці, ён крыкнуў коміваяжэру:

— Ну, ты — слімак! Паспрабуй яшчэ хоць раз паказацца ў пушчы? Чуеш, мас'е? Гэты лес наш! І мы яго не прадаём. Усё ў гэтай краіне наша. Скажы гэта сваім гаспадарам, пракляты лакей, перадай гэта пану Свянціцкаму! За гэты лес, за зямлю, за ўсё, што нам дала савецкая ўлада, мы будзем біцца з панамі да апошняй кроплі крыві. Чуеш, мас'е? Мы тут гаспадары! А калі хочаш трапіць у Магілеўскую губерню — прыходзь! Для такога дзярма кулі не пашкадуем. Знайшліся купцы на чужое дабро... Эй, хлопцы!

Некалькі чалавек ускочыла ў зямлянку.

Мос'е Пішэгру зноў завязалі вочы. Спатыкаючыся на пянчукі і купіны, ён пашоў тою дарогай, якою яго прыцягнулі сюды. Буйневіч з вінтоўкай і Мішка з паляўнічай стрэльбай вывелі яго на ўзлессе. Калі паказалася поле, Мішка, азірнуўшыся, прапанаваў:

— Ведаеш што: давай мы тут яго прыгалубім! Неспакойнае будзе маё сэрца, калі пусцім гэтага буржуя поўзаць па зямлі.

— Ну, ну, шчанюк! — злосна прыкрыкнуў на яго Буйневіч. — Я цябе прыгалублю!

— Тады, хоць крокаў за пяцьдзесят смальнуць у яго зад шротам, — ледзь не плачучы, стаў упрашваць Мішка. — Няхай тады выкалупляе. Яны гэтым панам пушкі даюць, ераплaны, каб нас біць, а мы што, нітралітэт? А-а? Чуеш, Змітрок?!..

Буйневіч раптам павярнуўся да Мішкі і скамячыў здаравенны кулак:

— Пагавары мне!

І Усёткі Мішка не сцярпеў, каб не стукнуць замежнага купца на развітанні каленам пад зад. Зрабіў ён гэта так спрытна, што Буйневіч нават не заўважыў.

Мос'е Пішэгру, узышоўшы на раллю, ступаў асцярожна, выцягнуўшы наперад рукі, як ходзіць сляпы. Потым, калі з лесу крыкнулі, каб ён зняў з вачэй павязку, спыніўся.

Агромністае, нібы набраклае крывёю, хавалася за небасхіл сонца. Ціха ўсё было навакол. Ніводная былінка травы не шавялілася на мяжы, ніводны гук не парушаў гэтай грозна-ўрачыстай маўклівасці.

Так, прыслухоўваючыся, прывыкаючы да святла, ён стаяў з хвіліну. А калі азірнуўся на лес, на месца, дзе засталіся Змітрок і Мішка, ужо нікога не было.



Кадр з фільма «Трактарысты».

„ТРАКТАРЫСТЫ“

(Новая камедыя вытворчасці Маскоўскай і Кіеўскай студый)

Другі сцэнарый ордэнаносца драматурга Памешчыкава «Полюшка-поле», па якому пастаўлена карціна «Трактарысты» (рэжысёр Пыр'еў), высока ўздымае тэму сацыялістычнага росквіту калгаснага жыцця. Гэта карціна не толькі рэалізуе калгасную тэму, але і абуджае ў гледача гарачую любоў да людзей і да жыцця нашых сёнешніх калгасаў. З гэтага пункту погляду «Трактарысты» вялікая і прынцыповая ўдача савецкага кіно, як у вырашэнні калгаснай тэматыкі, а таксама і ва ўдасканаленні складанага жанру кінокамедыі.

Калі да гэтага часу лічылася, што камедыя павінна была штосьці высмейваць, асуджаць, што для завязкі і сюжэтнага развіцця камедыі абавязкова патрэбна было налічча якой-небудзь адмоўнай з'явы, ці яго носьбіта, дык гэта камедыя праходзіць міма ўсіх гэтых прапісных канонаў.

Завязка і сюжэт будуецца на двух станоўчых вобразах: дэмабілізаваны танкіст Клім Ярко і знатная трактарыстка Мар'яна Бажан. Драматург-рамеснік, схематык не знайшоў-бы нічога ў іх для завязкі цэлага твору, але драматург-мастак знайшоў тут цікавы рамантычны пачатак. Адслужыўшы ў арміі патрэбны тэрмін, Клім Ярко едзе з двума сваімі таварышамі з Далёкага Усходу дамоў. Кліму, між іншым, усё роўна, куды ехаць. Першы таварыш кліча яго з сабою ў Маскву працаваць разам на заводзе «Шарикоподшипник», другі спакушае Кліма багатым прыгожым жыццём у калгасах сонечнай Грузіі. Гэта пачатак карціны.

Але Клім вызначыў сабе трэці шлях. Ён вырашыў паехаць да незнаёмай дзяўчыны. Гэту дзяўчыну ведала амаль уся краіна, яна была знатнай трактарысткай, яе партрэт красаваўся на першай старонцы ў газеце «Правда». І Клім паехаў да Мар'яны Бажан.

Гэта прыгожая рамантычная завязка пазбаўлена ўсякай лакіроўкі. Тут няма нічога непраўдападобнага і надуманага. Такі чалавек, як Клім, патрэбны усюды— на заводзе, фабрыцы, у калгасе, у МТС. Яго з радасцю прынялі ў МТС, на трактарах якой працавала і Мар'яна Бажан. Тут Кліма як быццам і чакалі. Як ніколі, у трактарных брыгадах МТС патрабаваўся дысцыплініраваны, з настойлівай воляй чалавек. Трэба было паставіць на ногі адну адстаючую брыгаду. І Клім пачынае гэту справу з пачуццём і тактам чалавека, які прайшоў бліскучую школу Чырвонай Арміі.

Едучы ў МТС да Мар'яны Бажан, Клім наўрад ці думаў, што Мар'яна прыме яго, палюбіць і стане для яго блізкім чалавекам. Самае вялікае, аб чым марыў Клім,—гэта дружная сумесная праца са знатнай і прыгожай дзяўчынай. Але такая ўжо наша рэчаіснасць. Адданая чэсная праца спараджае такую-ж і любоў. Мар'яна шчыра пакахала Кліма. Гэтаму каханню нельга не верыць, такое яно натуральнае і непазбежнае.

У фінальным эпізодзе з вяселлем рэжысёр, праўда, ударыўся ў гіпербалізацыю багацця і шчасця сваіх герояў. Рэдка яшчэ можна сустрэць у якой-небудзь МТС такую залу, амаль падобную на залу палаца, і наўрад ці з'ехалася-б столькі народу на вяселле скромнага трактарыста і яшчэ менш верагодна такое багацце він на бясконца доўгіх сталах. Але і тут хочацца чамусьці верыць, што іменна так было і магло быць—настолькі рэалістычна праўдзіва ўся карціна ў цэлым.

Рэалізм аўтарскага замыслу знайшоў тонкае ўвасабленне ў рэалістычнай ігры актораў. Арт. Нікалай Кручкоў— вучань і паслядоўнік лепшых рэалістычных традыцый савецкага кіномастацтва. На ўсім працягу сваёй працы ў кіно Кручкоў стварае станоўчыя вобразы герояў. І сіла мастацкага рэалізма была яму першым і верным памочнікам. Яго Клім Ярко — яркае ўвасабленне мастацкага рэалізма на экране.

У гэтай-жа манеры іграе і арт. Ладыніна ролю Мар'яны Бажан. Натуральнасць, прастата ў словах, у рухах; у манеры трымацца і ставіцца да людзей— пакідаюць уражанне непадробленай жыццёвай праўды.

Некалькі з іншымі ўстаноўкамі ў трактоўцы вобраза дырэктара МТС падышоў арт. Каюкоў. На працягу ўсёй ролі больш адчуваецца актор, чым вобраз. Тут многа непатрэбнага камікавання, якое часам нагадвае шарж і гратэск. Але ў межах задуманага вобраза і гэта знаходзіць якоесьці апраўданне і месца.

Менш удаліся другарадныя персанажы: Маркаўна, вартаўнік, сяброўкі Мар'яны і інш.

Але ў агульнай удачы фільма гэтыя дробныя недахопы праходзяць проста незаўважанымі.

Н. В-іч.

ВОЎК-ДЫПЛАМАТ

БАЙКА

Павадку воўчую напэўна кожны знае—
Калі панадзіцца авечак воўк цягаць
са стада,
То ўжо карцяць авечкі гаду,
Пакуль усіх не пацягае.
Манёры воўк, бывалы ў пераплётах,
(З калом не раз прыходзілася знацца).
З маленства меў вялікую ахвоту
Крывёю свежай ласавацца.
А каб хаваць зладзейскія сляды,
Ён чуткі распускаў заўзята,
Што, моў, авечку душыць ён тады,
Калі авечка вінавата.
Вось насылае воўк авечцы ноту:
Моў, так і так, вялікую ахвоту
Дружыць с табою маю
І вельмі запрашаю
Прысці ка мне, як змеркнецца, у госці.
Па чарцы вып'ем мы для весялосці
І пакалякаем аб справах нашых.—
Ледзь сонца села, проста з пашы
Авечка не без хвалявання
У лес к ваўку спяшае на спатканне
Пра дружбу марыць ды баіцца
Хапя-б ёй не спазніцца.
Не знаю, як ішлі перагаворы,
Ды толькі ўсім вядома стала скора,
Што не вярнулася авечка болей
Да стада свайго ў поле.
А воўк, расправіўшыся з першай,
Другой авечцы ноту склаў,
І тую ўжо лічы памершай,
І тую воўк за ноч задраў.
Аднойчы воўк на луг да рэчкі
У гурбу авечак сам прышоў
І гэтак гутарку павёў:
—Ну як па-вашаму, авечкі,
Сажру я вас усіх ці не?
Прашу адказваць зараз мне.
А хто асмеліцца маўчаць—
З таго я думаю пачаць.
Сярод авечак ёсць таксама дыпла-
маты—
Не знаю—з ласкі ці за плату,
Ды пачала адна перагаворы з воўкам,
Але яе асеклі лоўка,
І ўся гурба ваўку загаварыла:
— А ну-тка сунься з сваім рылам!
Адзін баран, сказаўшы грозна:
—Чашы адсюль, пакуль не позна,—
З разгону так ваўка азвячыў,
Што той як сноп ляпеў, няйначай,
І разы тры яшчэ куляўся
Пакуль на ногі ўзняўся.
Затым падбавілі кагалам,



Гнялі чарцяку чым папала,
Ды так нацёрлі яму пяткі,
Што ў дыпламата й слоў не стала—
Памчаў да лесу без агляпкі,
І доўга-доўга потым сніў,
Як на здабычу ён хадзіў.

З ваўком-агрэсарам—кароткі разгавор
Няма чаго лавіць варон там
Рыхтуе воўк агрэсію—давай адпор
Адзіным фронтам!

Л. КРУЦІЛАЎ.

ЛЕПШЫЯ КАЛЕКТЫВЫ Ў РАЁНЕ

Актыўны ўдзел ва ўсебеларускай алімпіядзе мастацкай самадзейнасці работнікаў промкааперацыі прынялі калектывы гор. Бабруйска.

Яўрэйскі драмкалектыў клуба промкааперацыі імя Комінтэрна паказаў п'есу Шолам-Алэйхема «Менахем-Мендэлэ» і заняў першае месца сярод іншых драмкалектываў. Высокае майстэрства праявілі домравы аркестр і танцавальны гурток гэтага клуба.

Асаблівай увагай на алімпіядзе карыстаўся вакальны жаночы ансамбль народных песень, арганізаваны бабруйскім вышывальным таварыствам. Ансамбль вылучан кандыдатам на Усесаюзную алімпіяду работнікаў промкааперацыі.

Лепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці прэміраваны.

І. УСАЎ.



Мастацкая самадзейнасць Н-скай часці БАВА. Фота Б. Равіча.



Група студэнтаў-выпускнікоў Дзяржаўнай Беларускай кансерваторыі і музычнага вучылішча, якія закончылі вучобу на «выдатна» і «добра». Стаяць (злева направа): **Запольская** (інструктар педагагічнага аддзялення музвучылішча), **Чэрэмісава** (вакальнае аддзяленне кансерваторыі) і **Зінкевіч** (інструктар педагагічнага аддзялення музвучылішча). Ля раяля **Шульман** (гісторыка-тэарэтычнае аддзяленне кансерваторыі).

Фотахроніка БЕЛТА.

„НЕДАРАСЛЬ“

(У Ленінградскім Дзяржаўным тэатры імя Ленсовета)

«Недарасль» — першая арыгінальная руская сатыра, накіраваная аўтарам яе— Д. І. Фанвізіным супроць невуцтва дробнага і сярэдняга дваранства, супроць яго свавольства і драпежніцкага карыстання прыгонніцкімі правамі.

Пры сцэнічнай інтэрпрэтацыі гэтай сатыры тэатр павінен быў знайсці адпаведныя яе зместу і характарам дзеючых асоб гратэскавыя і яркія камедыйныя фарбы.

Аднак Ленінградскі тэатр падышоў да гэтага твору, як да бытавой камедыі, а мала таго, яшчэ пачаў паглыбляцца ў псіхалогію дзеючых асоб.

І пастаноўшчык спектакля В. С. Іогельсен прымушае актораў іграць не тое, што ім дадзена аўтарскім тэкстам, прымушае шукаць бытавыя фарбы для выяўлення гратэскавых сітуацый.

Арт. Н. В. Фаусек падышла да характара Прастаковай з прыёмамі ігры бытавой камедыі Астроўскага і замест карыкатуры на тупую вузкалобую прыгонніцу, накшталт Салтычыхі, стварыла вобраз свавольнай дурной жанчыны і ўлюбёнай у свайго сына маці. Апошняя акалічнасць ачалавечвае Прастакову і глядач мімаволі даруе ёй усе злачынствы, калі гэты сын — Мітрафан адштурхвае яе ў фінале камедыі.

Не павінна быць у Прастаковай ні мяккіх інтанацый, ні паслядоўных перажыванняў. Не разгубленасць авалодвае Прастаковай, калі яна сутыкаецца з незнаёмым словам «геаграфія», а падазронасць— «ці не хаваецца за гэтым незнаёмым словам які-небудзь падвох». Просталінейная скацінінская сквапнасць, падазронасць, свавольства і тупасць уласцівы вобразу Прастаковай. І праз вострыя і рэзкія прыёмы гратэскавага выканання павінен гэты вобраз даносіцца да гледача.

Прастакоў у камедыі Фанвізіна забіты, затурканы, бязвольны муж, які не адыгрывае ніякай ролі ў жыцці свайй сям'і. Калі-б арт. Н. А. Глебаў, які выконвае гэту ролю, знайшоў адпаведныя сцэнічныя фарбы, то гэты характар адыграў-бы сваю ролю ў спектаклі, але артыст вырашае яго ў бытавым плане, а ў выніку ён непрыкметная асоба не толькі ў хатнім жыцці Прастаковых, але і на сцэне.

Мітрафан — нашчадак Скацініных, прадукт скацінінскага выхавання — лянотны, тупы, распусны, самаўпэўнены невук і свавольнік — у выкананні арт. Н. Н. Глаголева ператварыўся ў дурнаватага, капрызнага хлапчука-галубятніка. Няма ў ім рысаў, дзякуючы якім імя Мітрафанушкі зрабілася нарыцацельным. Нічым не апраўдана няхлюйства ў яго туалеце, якога ніколі-б не даравала Ерэмееўне Прастакова.

Зусім бледна і аднатонна выконвае арт. Н. М. Злобіна ролю Ерэмееўны. Няма ў гэтым вобразе ні шчырасці, ні рэзкіх граней, а праз гэта гінуць для гледача і слёзы, і крыўды яе. Артыстка не зразумела, што Ерэмееўна глядзіць на Мітрафана вачыма Прастаковай, што яна сапраўды гатова за яго павыдзіраць вочы Скаціміну, што яна верны слуга, які служыць не за страх, а за сумленне. І крыўда, якую наносіць ёй Прастакова, для яе вельмі балючая.

Праўдзін — персанаж службовы, патрэбны для выслухоўвання сентэнцый Старадума і для развязвання камедыі ў канцы яе, трактуецца артыстам у асноўным правільна. Да заган выканання гэтай ролі Е. К. Забіякіным трэба аднесці некаторую ўнутраную пустату, якую артыст стараецца захаваць пад штучным хваляваннем.

Станоўчым у ігры артыста Г. С. Гурэвіча (Старадум) з'яўляецца тэмперамент, з якім ён выконвае сваю ролю. Гэта прымушае гледача слухаць доўгія разважанні разанёра. Але мы пажадалі-б артысту пазбавіцца штучнасці ў паходцы і некаторай лішняй мітуслівасці.

Выкананне ролі Соф'і арт. Н. Д. Уладзіміравай пазбаўлена якіх-бы то ні было камедыйных фарбаў. У выніку атрымліваецца не камедыйны персанаж, а «меладраматычная нявіннасць». Гэты меладраматызм вобраза яшчэ больш паглыбляецца песенькай Соф'і ў пачатку 4-га акта.

Вельмі імпазантная фігура ў спектаклі Мілона ў выкананні арт. Р. І. Каліноўскага. Але, нажаль, артыст зусім не запаўняе адпаведнай ігрой пауз паміж сваімі рэплікамі і яму, відаць, вельмі перашкаджае афіцэрскі палаш, насіць які і абыгрываць усё-такі варта было-б навучыцца.

Скацінін у выкананні арт. С. Л. Кайдзінава найбольш выразная і камедыйная фігура ў спектаклі. Аднак, і гэтаму персанажу нехапае скацінінскай тупасці і ўпартасці, якія далі-б артысту значныя магчымасці для больш яркіх і рэзкіх рысаў гратэскавай падачы характара. Без гэтага Скацінін занадта абыякавы і свойскі.

Цікавы камедыйны вобраз створан арт. Н. Д. Лапіным (Куцейкін). Гэта, бадай што, адзіны, апрача Цыфыркіна, персанаж у спектаклі, які адпавядае стылю і зместу сатыры. Аднак, агульная накіраванасць спектакля зрабіла тое, што ў сцэне бойкі з Вральманам і гэты выканаўца апусціўся да бытаўшчыны. І яшчэ ў апошняй сцэне Куцейкін, захоўваючы павольна знадворны рысунак, застаецца ўнутрана пустым, дзякуючы чаму трапіць сваю пераканӑўчасць.

Зусім верны камедыйны вобраз адстаўнога салдата Цыфыркіна стварыў арт. П. Р. Антановіч.

Артыстам Н. С. Трафімавым не створан вобраз Фурмана Вральмана—Мітрафанавага настаўніка. Толькі ў адной сцэне, якую трэба аднесці да заслугі рэжысёра (калі Вральман манежыць Мітрафана), артыст знаходзіць сапраўдныя рысы вобраза.

Прыемнае ўражанне пакідае вопратка персанажаў мастака А. М. Мінчыкоўскага. У ёй адчуваецца і мастацкі густ, і разуменне эпохі і камедыі. Што датычыць дэкарацый, то хоць яны і зроблены з пэўным мастацкім тактам і густам, але зусім незразумела, навошта амаль кожную дзею стаўляць у новай абстаноўцы, калі ўсю камедыю можна было без усякай хібы сыграць у дэкарацыях другой дзеі.

Наогул трэба сказаць, што гэты спектакль не з'яўляецца пэўным дасягненнем тэатра. І на нашу думку пастаноўшчыку яго—В. С. Іогельсену варта пераглядзець свае адносіны да сатыры Фанвізіна.

Алег СОЖЫН.

КАЛГАСНЫ ДРАМГУРТОК

Драмгурток калгаса «Комунар» Талькаўскага сельсовета Пухавіцкага раёна за бягучы год паставіў на сваёй сцэне два вадэвілі паэта-ордэнаносца Я Купалы — «Паўлінка» і «Прымакі».

Да XIX гадавіны вызвалення Беларусі ад белапалякаў драмгурток рыхтуе ўрывак з п'есы Крапівы «Хто смяецца апошнім».

А. П.

Е. САДОЎСКІ

ПАВЕЛ УСАЧ

(АПАВЯДАННЕ)

Павел Усач, Наум Штэйн Пая і яшчэ некалькі байцоў з палка Дзям'яна Карытнага стаяць у ахове поезда Орджанікідзе. Заступілі ноччу. Раніцой, калі развіднела, Павел здалёку ўбачыў знаёмага чалавека, з якім не сустракаўся з 1917 года.

Павел хацеў аклікнуць знаёмага, але ўспомніў, што стаіць на пасту і ўстрымаўся.

Раніцою ў вагон Серго прайшоў Аляксандр Мяснікоў. Учора ён выступаў у байцоў палка Карытнага, і Павел Усач адразу пазнаў яго. Плячысты, мужны, з шырокім дабрадушным тварам, ён лёгка ўзышоў на ступенькі пасажырскага вагона, прыклаўшы руку да казырка зялёнай шапкі. Усач выцягнуўся перад Мяснікоўым. Той дабрадушна ўсміхнуўся яго маладцаватай выпраўцы.

— Не замерзлі, таварыш?

— Не, таварыш камандзір. Добрая ноч была.

Пад караульнае памяшканне адведзена брызентавая палатка, ускудлачаная, уся ў латах. Змяніўшыся, Усач ідзе заснуць на гадзіну. Ля вітрыны, прымацаванай да свежаўкапаных слупоў, сабраўся натоўп. Толькі-што вывесілі новы нумар газеты 16 арміі «Чырвонаармеец». Надрукаваны ў вагоне-друкарні «Энергія» газетны ліст аддае пахам друкарскай фарбы і бензіну...

«Белапалякі варварскі разбураюць Барысаў,—чытае хтосьці ў першым радзе...» Усач па голасу пазнае Душко... «Родны горад Душко разбураюць»,—думае пра сябе Павел і імкнецца скрозь натоўп прабіцца да Душко...

— Чаго, грамадзянін, штурхаецеся,— чуе ён над сабою чыёсьці нестрымліваючае абурэнне. Ён аглядаецца. Ззаду яго стаіць той знаёмы, якога ён ужо бачыў, калі стаяў на пасту. Некалькі імгненняў Павел напружвае сваю памяць, імкнецца прыгадаць яго прозвішча.

— Араноўскі, якім чынам ты тут?..

Рослы мужчына сярэдніх год, у зялёнай гімнасцёрцы, якая няскладна ляжала на плячах—на секунду, непрыкметную для вока, выражае сваім тварам недаўменне і быццам раздумвае над адказам.

— Матрос другога класа Усач, о божа, гара з гарой не сыходзяцца, а чалавек з чалавекам на кожным кроку...

Яны выйшлі з натоўпу.

— На цябе пагля̆дзець — мачта!

Рослы дастаў папяросу. Усач прымае з яго рук папяросу з тонкім мундштуком і доўга разглядае яе ў руках.

— Даўно ты тут?—спытаў Араноўскі, падносячы зажыгалку.

— З самага пачатку стаім...

— І доўга яшчэ стаяць будзеце?

— Пачакай, ты чаму гэта гаворыш «будзеце», а сам што, уязджаць збіраешся?— спытаў Усач, прыхіляючыся да прыстанцыйнага плоту.

— Не, я толькі прыехаў.

— Адкуль-жа цябе гоніць?

— Вось пытанне! У матроса, брат, не пытайся. Ён сёння тут — заўтра там.

— Ты не залівай, а адказвай прама. Бач ты, у матросы зацясаўся...

— А ўсё-ж плаваў,—панура адказаў рослы і, не дакурыўшы, далёка кінуў сваю папяросу...

Усач плаваў на адным караблі. Араноўскі на другім. Караблі ўваходзілі ў адну эскадру. Аб Араноўскім сярод матросаў ішла нядобрая слава. Ён быў з тых боцманаў, што матросы спакон веку завуць шкурамі. У 1917 годзе такіх без усякага жалю выкідвалі за борт. Араноўскі ўцалеў. Усач нездарма здзівіўся, убачыўшы на ім чырвонаармейскую гімнасцёрку.

— Ты старое не памінай,—сказаў Араноўскі, гледзячы Усачу ва ўпор.—Я ў 1918 годзе—як сышоў з матроскім этрадам з палубы—ні хвіліны не пакідаў яго радоў. Бачыш—шчака папарапана. Ведай нашых — дзве кулі прыняў. Адна на ўсё жыццё след пакінула. А што гэта за вялікі начальнік ваш будзе?—паказаў рослы у бок поезда Орджанікідзе, загадкава змяняючы тон.

— Чаму так пытаешся?—здзівіўся Усач.—Як гэта: «наш будзе?». А табе што-ж ён, не начальнік?

— Ты, братухна, не прыдзірайся. Толькі прыехаў—таму так запытаўся...

Усач нічога не адказаў.

Рослы з хвіліну пастаяў, таямніча азіраючыся па баках, а потым шапнуў на вуха Усачу.

—Выпіць хочаш? Я, братуха, такога віна раздабыў, што ты ніколі не піў.

— Вось не разумею, дзе ты такое віно выцарапаў? — прадаўжаў здзіўляцца Усач.

— Ну і чалавек! — нездаволена вымавіў рослы. — Усё яму растлумач, усё яму пакажы. З Масквы еду, ну і зразумела. Гавары, калі піць хочаш, разап'ём, а там у мяне справа да цябе будзе.

Усач быў у нерашучасці. Самае правільнае — адмовіцца. А калі, ён адмаўляючыся, упусціць што-небудзь важнае? Падазроны ён вельмі. Потым яшчэ абвінавацяць, што звязаўся чорт ведае з кім.

— Як-бы паступіў на маім месцы Штэйн? — гэта думка ўзнікла імгненна.

— Ну, чаго раздумваеш, — пойдзем піць, —сказаў рослы і па сяброўску паляскаў Усача па плячу.

— Выпіць, прызнацца, ахвота, — адказаў Усач. — але можа дазволіш для кампаніі яшчэ аднаго чалавека запрасіць? Тут у мяне сябра ёсць — Штэйнам завецца. Гісторык. Галава, што ў капітана. Бывай здаровы.

— Не, з трэцім не выйдзе, — адмовіўся рослы. — Што нам на трох адна бутэлька? Пойдзем самі....

Яны адышлі да лесу. Рослы выняў з кішэні бутэльку віна і, усаджваючыся на зямлю, хлопнуў рукой па дну. Корак з шумам адляцеў на некалькі шагоў. Ля самага горлышка віно запенілася.

— Шклянак няма, не крыўдзіся, — выпі першым, а я рэшту...

Усач хлябнуў некалькі глыткоў і аддаў бутэльку.

— Бяры яшчэ.

— Хопіць, моцная, сволач!

— Боцман Араноўскі абы-што піць не возьме. Хочаш?

— Не, не хачу.

— Мала адпіў. Ну, усё роўна. За тваё здароўе, — і рослы закінуўшы галаву, амаль адным махам выпіў больш чым тры чвэрці бутэлькі моцнага віна. Адпіўшы, ён кракнуў ад здавальнення і рукавом ад гімнасцёркі выцер мокрыя губы.

— Сапраўды, моцная, сволач, — сказаў ён крыху аддыхаўшыся. — Цяпер-бы закусіць чым-небудзь, ды па паходнаму і так сыйдзе... Слухай, матрос другога класа, — загадкава прагаварыў ён, падсаджваючыся да Усача. — Скардзіўся ты мне, што маці без кароўкі засталася... А хочаш маці падарунак зрабіць — не на адну, а на тры-пяць кароў грошай паслаць? Скажы, хочаш? Так, ці не? Ну, адразу не можаш, дык падумай. Падумай, чорт з табой, там маці без кароўкі, а ён яшчэ раздумвае, — зусім ахмялеўшы, сярдзіта прагаварыў рослы апошнія словы.

— Грошы тыя, вядома, патрэбны, — лаканічна адказаў Усач.

— Ну, калі патрэбны, дык і згаджайся.

— Гледзячы на што, — сказаў Усач, папраўляючы лямку ад паходнай сумкі.

— Ну, быццам і не разумееш.

— Цьфу, чорт, муціць і муціць, а што, не зразумець, — пакрыўджана плюнуў чырвонаармеец.

— Дык слухай, — Араноўскі на хвіліну задумаўся. Ён адчуў, што зайшоў вельмі далёка з гэтым чалавекам, ён сам баяўся яго, але зараз вырашыў не адступаць ад сваёй палітыкі — дзейнічаць напрамік і прывабіць Усача матэрыяльнымі выгодамі. Ён дастаў папяросу і пасля некаторага раздум'я працягваў гутарку.

— У адным месцы вельмі цікавяцца, калі будзе пераход праз Бярэзіну. Ты гэта праведай ці паперку прынясі, а наконт грошай не турбуйся — пяць кароў матцы безумоўна будзе, а то і хатку пабудуеце...

— Ага, — працягнуў Усач і глыбока зацягнуўся дымам. — Разумею! — Цяпер у яго не было сумненняў, з кім ён мае справу.

— Эх, каб яшчэ вінца, — сказаў рослы і прычмокнуў губамі. — А ты ці піў-бы? — запытаўся ён, хмурачы бровы, заўважыўшы, што Усач думае аб чымсьці іншым.

— Цьфу, нячыстая сіла, хочаш я табе зараз грошай дам. Якімі даць? Вазьмі, старымі, нашымі, чужымі, — і ён пацягнуўся ў кішэню.

Усач адвёў яго руку з грашыма:

— Не, з гэтым пачакай. Я жартаваў. Паспееш. Ты вось скажы, для каго і для чаго гэта?

— Вось гэта ўжо па-бабску. Патрэбна, і ўсё...

— Не сярдуй, сам разумееш: сур'ёзная справа, — падрабляючыся ў тон росламу, адказаў Усач. — Ты дзе будзеш?

— Ну, хоць-бы і тут, увечары.

— Добра! — і Усач, не развітаўшыся, пайшоў.

Першым, каго ён сустрэў ля вакзала, быў Штэйн. Ён паклікаў яго і расказаў, дзе быў.

— Што рабіць, Навум? Зараз з ім расквітацца, ці пачакаць?

— А ты ў ЧК быў?

З станцыйнага памяшкання вышаў Дзям'ян Карытны. Яны ўдвух падышлі да яго.

Карытны моўчкі выслухаў Усача.

— Дык ты, гаворыш, рослы ён такі? Вось чаму значыць ён да мяне прыходзіў, у полк прасіўся. Так. Ён вядома не адзін, з ім шайка, яе і вылавіць трэба.

І Карытны паслаў Усача ў ЧК. Праз некалькі хвілін Павел сядзеў у невялікім пакойчыку, які раней служыў вакзальным буфетам, і, прыкметна хвалюючыся, расказваў упаўнаважанаму, пажыламу, гаспенаму чалавеку, аб сваёй сустрэчы з боцманам Араноўскім і аб размове, якая была з ім.

Упаўнаважаны слухаў, не перапыняючы, потым, калі Усач кончыў гаварыць, ён устаў з-за стала.

— Што вы адказалі гэтаму мярзотніку?

— Ды накшталт згоды даў... Пабаяўся, што ён няздоўленым збяжыць.

Упаўнаважаны шчыльней завесіў акно. Потым ён на некаторы час вышаў і вярнуўшыся, паклікаў з сабою Усача. Ён прывёў яго ў поезд Орджанікідзе да Мяснікова. Цяпер Мяснікоў быў без шынеля, у зялёным ваенным касцюме. Ён хадзіў па вагону з кута ў кут, заклаўшы рукі за спіну і аб чымсьці думаў. Калі ўвайшлі Кузняцоў і Усач, ён на міг спыніўся і паглядзеў на Паўла.

— Аляксандр Фёдаравіч, — звярнуўся ўпаўнаважаны да Мяснікова, — вось чырвонаармеец, аб якім я вам гаварыў.

Мяснікоў зноў пільна паглядзеў на Усача.

— Вы ні слова не выдумалі з таго, што расказвалі Кузняцову?

Усач цвёрда адказаў:

— Не.

— Распараджэнне дадзена ў адносінах таго, хто рабіў яму прапанову? — запытаўся Мяснікоў, спыняючыся каля Кузняцова.

— Усё зроблена, Аляксандр Фёдаравіч.

Увечары на тым-жа месцы, на ўскраіне лесу Усач знайшоў рослага. Той расцягнуўся на траве і дрымаў. Усач крануў яго за плячо, рослы пужліва ўстрапянуўся і раскрыў вочы. Убачыўшы Усача, ён заспакоіўся.

— Уздрымнуў крыху, думаў, што спалохаўся, не прыдзеш.

— Іш, нявера, у мяне калі сказана — зроблена, — адказаў Усач, прысаджваючыся каля рослага.

— Ужо маці цябе аддзякуе, — усміхаючыся сказаў рослы.

Усач палез у кішэню і дастаў з запісной кніжачкі ўчанвёра складзены лісток. Спісаны дробнымі літарамі, гэты лісток быў перададзен яму Кузняцовым і змяшчаў матэрыял, супрацьлеглы сапраўднаму плану.

— Паслухай, боцман,—спытаў Усач, затрымліваючы ў сваіх руках паперку, ты можа і мяне з сабою возьмеш? А тут яшчэ могуць даведацца, тады мне і не адабраваць.

Боцман не згадзіўся.

— Браць цябе не вазьму, а я заўтра раніцою тут буду яшчэ з адным, тады і дамовімся.

Араноўскі пайшоў. Усач стаў здалёку сачыць за ім. Спачатку ён ішоў лесам, а потым звярнуў на запушчаную сцежку і вышаў да берага. Там яго чакаў адзін цывільны і яны ўвайшлі ў берагавую хатку. Потым да берага прыстала лодка, Араноўскі ўсадзіў у яе цывільнага, адштурхнуў лодку і стаў махаць шапкай. Потым ён павярнуўся і, не спяшаючыся, пайшоў да лесу. Усач усё гэта было добра відаць. Каб не сустракацца з Араноўскім, ён паспяшыў на станцыю і, нават не аддыхаўшыся ад быстрай хады і бегу, увайшоў у памяшканне ЧК. Упаўнаважаны сустрэў яго ля дзвярэй.

— Таварыш Кузняцоў, дакладна прасачыў, дзе гэта сволач цэнтр мае.

Чэкіст усміхнуўся:

— Скажы, праверым, ці правільныя ў цябе звесткі.

Усач расказаў.

— Хатка, у якой бакеншчык жыве. Добра! Прашчупаем.

Увечары нарад байцоў накрыў цэлую банду. Сярод затрыманых быў Араноўскі. Правёў нарад да места Усач. Кузняцоў ад імя Мяснікова падзякаваў яго за раскрыццё шпіёнскай шайкі і сказаў, што аб гэтым паведамлена ў Маскву.

Штэйн быў асабліва задаволен поспехам таварыша. Дзям'ян Карытны па-сяброўску паляскаў яго па плячу:

— Дзякуй, зямляк. Можаш рыхтавацца да вялікай справы. Чуеш, нашы гарматы забухалі, будзем наступаць.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка, Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду.

Уп. Галоўлітбела № Р—1221.